

# РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

№ 5 МАЙ 1955 г.




ЧАЛАВЕК заўсёды радасна сустракае вясну, калі абуджаюцца сілы прыроды, набухае сокамі зямля, зеляненюць палі.

Вясеннія дні нашай краіны поўны высокага натхнення. Вялікімі надзеямі і марамі жыве савецкі чалавек. Ён ведае, што ў 1955 годзе завяршаецца пяты пяцігадовы план, які нясе далейшае ўмацаванне нашай Радзіме, яе народнай гаспадарцы. У строй увойдуць новыя карпусы фабрык і заводаў, электрастанцый, навуковых устаноў, жылых дамоў і ясляў.

Расце і шырыцца фронт наступлення на цалінныя і абложныя землі. Ужо ў наступным годзе мяркуецца асвоіць плошчу ў 28—30 мільёнаў гектараў. Савецкія людзі змагаюцца за тое, каб у бліжэйшыя гады давесці збор збожжа да 10 мільярдаў пудоў у год. Гэтыя грандыёзныя планы пад сілу савецкім людзям.

Мірнае жыццё савецкай краіны, росквіт яе эканомікі і культуры не даспадобы заходнееўрапейскім і амерыканскім агрэсарам. Усё часцей кідаюцца яны бессардэчным словам «вайна». Гэтыя гандляры крывёю пасягаюць на самае свяшчэннае, на самае дарагое—жыццё чалавека. Яны ні перад чым не спыняюцца. Найвялікшае адкрыццё нашага веку—атамную энергію—збіраюцца выкарыстаць не для жыцця, а для смерці.

Савецкім людзям мір асабліва дарагі, бо ён аплочаны вялікімі ахвярамі. Мы не забылі руін і папялішчаў, у якія былі ператвораны нашы гарады і вёскі. Мы не забылі, як аднаўлялі іх на працягу дзесяцігод і будавалі занова. А той, хто будуе, не імкнецца да разбурэння; той, хто са зброяй у руках змагаўся за мір, не дазволіць уцягнуць народы ў бездань атамнай бойні.

Ставячы свае подпісы пад Зваротам Сусветнага Савета Міру, савецкія людзі, як адзін чалавек, заяўлялі: «Не пашкадуем працы для міру». Свае словы яны ператвараюць у справу. Супрацоўніца Мінскага вагонарамонтнага завода тав. Матвеенка заявіла: «Мы—жанчыны-работніцы, маццеры і жонкі—не жадаем вайны! Мы патрабуем спынення атамнага ўзбраення! Няхай наш голас пратэсту сальецца ў адзіны многамільённы голас пратэсту жанчын усяго прагрэсіўнага чалавецтва. Мы жадаем жыць і працаваць у дружбе з усімі народамі на зямлі. Мы жадаем шчаслівай будучыні».

Работніца ліцейнага цэха Мінскага аўтазавода тав. Бажэнка сказала: «Жанчына носіць вялікае імя маці. Мацеры, усе жанчыны свету—вялікая сіла, якая здольна зрабіць многае для прадухілення вайны, для ўмацавання міру. Наша задача—дзейнічаць для абароны міру разам з усім народам, самаадданa працаваць у імя нашых дзяцей. Дзеці—гэта будучыня кожнай краіны. Дзеці не павінны ведаць жахаў вайны і пакут, яны не павінны страціць бацькоў, яны павінны быць шчаслівыя».

Савецкія людзі непахісна імкнуцца да міру. У гэтыя вясеннія дні натхнёнай працы мы ні на хвіліну не забываем аб захаванні міру на зямлі.

Пад свяшчэнным словам «мір» паставіла свае подпісы ўсё дарослае насельніцтва Савецкага Саюза. 220 мільёнаў подпісаў савецкіх людзей з'яўляюцца ўвасабленнем іх волі, яркім выражэннем сілы і гатоўнасці змагацца за мір, адстойваць яго паслядоўна і беззапаветна.

Гэтая вясна знамянальна не толькі ў жыцці нашай краіны. Народы ўсяго свету ўсё мацней уздымаюць свой гнеўны голас супроць падпальшчыкаў новай вайны. Сотні мільёнаў подпісаў, пастаўленых пад Зваротам Сусветнага Савета Міру на ўсіх кантынентах свету, з'яўляюцца грозным перасцярогай вар'ятам, якія размахваюць атамнай бомбай.

Агрэсары не павінны забываць, што большая палова насельніцтва зямнога шара абудзілася да новага жыцця. Амаль палова ўсяго азіяцкага насельніцтва жыве ў краінах народнай дэмакратыі. Народы Азіі бяруць справу міру ў свае рукі. Прадстаўніца Індыі Рамешвары Неру, адкрываючы Азіяцкую канферэнцыю па аслабленню напружанасці ў міжнародных адносінах, сказала: «Мір таксама неабходны для жыцця нашых народаў, як страва і вада для жыцця чалавека». 400 мільёнаў подпісаў кітайскага народа пад Зваротам з'яўляюцца яркім сведчаннем глыбіні і праўдзівасці гэтых слоў.

У другой палове чэрвеня гэтага года адбудзецца Сусветная асамблея міру ў Хельсінкі (Фінляндыя). Туды з'едуцца прадстаўнікі розных краін. Палымяныя барацьбіты за мір, за шчасце людзей на зямлі скажуць сваё важкае слова. Іх слова ў абарону міру, блізкае і дарагое кожнаму сумленнаму чалавеку, дойдзе праз моры і акіяны, западзе ў сэрца і пакліча да барацьбы.

Народы свету маюць усе магчымасці і павінны адстаяць мір на зямлі. Гэта будзе залежаць ад кожнага мужчыны і жанчыны, ад іх цвёрдасці і непахіснасці ў барацьбе за мір.

Народныя пасланцы нашай краіны прымуць гарачы ўдзел у рабоце Асамблеі Міру. Яны выкажуць самую запаветную думку свайго міралюбівага народа—барацьбіта і змагара за шчасце чалавека, народа, які яшчэ 37 год назад прыняў дэкрэт аб міры.

Вясна чалавецтва будзе квітнець і красаваць над светам.

→

На здымку (зверху): **Мінск. Калона дэманстрантаў на святкаванні 1 мая 1955 года;** (унізе): **парад войск Мінскага гарнізона.**

Фото П. Нікіціна.

55.64.4379

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

ВЫДАННЕ ЦК КП БЕЛАРУСІ

ГОД ВЫДАННЯ ТРЫЦЦАЦЬ ПЕРШЫ

№ 5

МАЙ 1955



Б/5 1979





# Фрэзероўшчыцы

НА МІНСКІМ трактарным заводзе ёсць участак, на чале якога ўжо трэці год стаіць адзін з лепшых майстроў — Фёдар Бяляснікаў. Чалавек ён не малады. За яго плячыма звыш трыццаці год вытворчага стажу.

На ўчастак Фёдар Ягоравіч прыйшоў ранняй вясной 1953 года.

Завод атрымаў тады адказнае ўрадавае заданне — асвоіць і перайсці да масавага выпуску новых трактараў для сельскай гаспадаркі.

Велізарнаму заводу патрабаваліся не адзінкі, нават не сотні, а тысячы і тысячы рознастайных разцоў і нажоў да фрэзаў...

Гэтая важная справа была ўскладзена на адзін з участкаў інструментальнага цэха, старшым майстрам якога быў Фёдар Бяляснікаў.

— З кім-жа я буду працаваць? Праграма вялікая, а людзей на ўчастку пералічыш па пальцах, — заявіў неяк начальніку цэха Фёдар Ягоравіч.

— Як гэта з кім? — здзівіўся начальнік цэха. — Вядома, з людзьмі. Набярыце дзяўчат, навучыце іх і давайце заводу інструмент. У вас ёсць спрактыкаваныя фрэзероўшчыцы, яны і дапамогуць падрыхтаваць новыя кадры...

Іменна да іх, да дзяўчат-фрэзероўшчыц, і звярнуўся тады за дапамогай старшы майстар. Зіна Сакалоўская, Каця Бойка, Вольга Акуліч, Вера Барыкіна і Каця Бугай складалі асноўнае ядро ўмелых работніц участка.

— Бярыце, таварыш майстар, дзяўчат, — адказалі яны, — зробім з іх добрых фрэзероўшчыц!

І вось на ўчастак пачалі прыходзіць дзяўчаты. Упершыню ў сваім жыцці яны ўбачылі велізарны цэх, дзе стаяў несціханы гуд ад работы мноства токарных, фрэзерных, шліфавальных станкоў.

Ішлі дні, месяцы...

З велізарнай упартасцю і настойлівасцю змагаўся калектыў за поўнае выкарыстанне магутнасцей сваіх станкоў.

Аднойчы лепшыя фрэзероўшчыцы ўчастка Зіна Сакалоўская і Вольга Акуліч паведамілі майстру, што яны рашылі даваць за змену гатовых 100 разцоў, замест 60—70 па норме.

— Толькі забяспечце нас загатоўкамі, — сказалі яны.

Гэты смелы пачын падхапілі ўсе фрэзероўшчыцы ўчастка.

**Майстар прызматычнага ўчастка інструментальнага цэха Вера Нейла паказвае фрэзероўшчыцам Ніне Арлоўскай, Мар'і Шымановіч, Мар'і Шыкінай і Валі Шчацько правільнасць апрацоўкі разца.**

Фото П. Нікіціна

Лепшая стрыжнёўшчыца фармовачнага цэха завода імя Варашылава Ганна Лаўнікава, якая выконвае месячную норму на 200—220 прац.

Фото П. Нікіціна



Майстар прыняў належныя захады для забеспячэння ўчастка металам.

У спаборніцтва ўключыліся абедзве змены. І калі на чарговай вытворчай нарадзе падвялі першыя вынікі, то аказалася, што абедзве змены праграмныя заданні завяршылі паспяхова.

У пачатку 1955 года ўчастак атрымаў павышаныя праграмныя заданні. Цэхі завода патрабавалі ўсё больш рэжучага інструмента. Калектыў участка пачаў шукаць новыя рэзервы для павелічэння выпуску прадукцыі.

Спрактыкаваныя фрэзероўшчыцы ў параўнанні з маладымі работніцамі давалі ў паўтара раза, а часам і больш прадукцыі са сваіх станкоў. А тлумачылася гэта тым, што новых работніц ставілі да станкоў побач з такімі-ж маладымі, у якіх пакуль што нельга было навучыцца прадукцыйнай рабоце. І вось лепшыя фрэзероўшчыцы ўчастка Вольга Акуліч і Маруся Трусава са змены майстра Нейла, Вера Барыкіна і Зіна Сакалоўская са змены майстра Новікава прапанавалі пераставіць людзей.

— Побач з намі, — сказалі яны, — пастаўце нашых былых вучаніц. Мы зможам дапамагаць ім у настройцы станкоў, правільна разбірацца ў чарцяжах.

Зменныя майстры падтрымалі прапанову фрэзероўшчыц. Рацыянальная расстаноўка людзей дала адразу-ж адчувальныя вынікі. Маладыя работніцы пачалі працаваць больш упэўнена, лепш настройваць свае станкі, эканоміць час на падрыхтоўку да работы з новымі партыямі разцоў. Прадукцыйнасць працы ў многіх прыкметна павысілася.

Работа пайшла спарней. Участак з кожным днём павышаў тэмпы.

Неяк перад канцом змены Вольга Акуліч падышла да сваёй вучаніцы Валі Шчацько, якая выконвала тэрміновую работу на вырабу разцоў з падвойнай пласцінкай. Вольга ведала, што гэта было адказнае заданне, і таму ўважліва сачыла за сваёй вучаніцай. Калі-ж на яе тумбачцы вырасла горка прамавугольных разцоў, яна падышла паглядзець. Уважліва і прыдзірліва аглядала кожны разец. Потым, узяўшы ў рукі чарцёж, доўга ўглядалася ў яго.

— Стамілася?

— Як сказаць... Сама бачыш — паўтары нормы...

— О, гэта ўжо добра!

Хутка разцы былі прыняты кантралёрам, і Валя, задаволеная праробленым, пачала старанна прыбіраць свой станок.

... Так маладыя работніцы асвойвалі прафесію, а разам з ёй і новыя прагрэсіўна-тэхнічныя нормы.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж зменамі разгарэлася з новаю сілай. У выніку ўчастак завяршыў датэрмінова павышаную вытворчую праграму першага квартала 1955 года, выканаўшы яе на 105,4 працэнта. Фрэзероўшчыцы Вольга Акуліч, Маруся Трусава, Вера Барыкіна, Зіна Сакалоўская, Каця Бугай перакрылі свае нормы і пачалі працаваць у рахунак плана 1956 года.

Зараз калектыў участка, апіраючыся на багаты вопыт перадавікоў вытворчасці і перадавыя метады працы, разгарнуў сацыялістычнае спаборніцтва за права першымі рапартаваць аб датэрміновым выкананні гадавога плана.

І мы не сумняваемся, што так яно і будзе.

**А. КАЗЛОЎ,**

слесар інструментальнага цэха Мінскага трактарнага завода.



Гомельскі шклозавод імя Сталіна асвоіў выпуск новага будаўнічага і цеплаізаляцыйнага матэрыялу — пенашкла. Пенашкло лёгка паддаецца апрацоўцы, у яго можна забіваць цвікі, яно марозаўстойлівае, не гніе, плавае ў вадзе. Тэхналогія вытворчасці пенашкла вельмі простая. На здымку: апілоўшчыца камсамолка В. Н. Адарчанка аглядае гатовыя блокі. Норму яна выконвае на 165 прац. і больш.

Фото В. Дагаева

# Вырасцім высокі ўраджай кукурузы

Кукуруза — вельмі пашыраная культура і мае рознастайнае выкарыстанне. У яе зерні ад 63 да 80 прац. крухмалу, да 13 прац. бялку, да 8 прац. тлушчу. Па каларыйнасці яна перавышае авёс і ячмень амаль у паўтара раза.

З кукурузнага зерня атрымліваюць значную колькасць харчовых прадуктаў. З кукурузнай мукі ў сумесі з пшанічнай і жытняй выпякаюць хлеб, чурэкі, бліны, праснакі. На абед з кукурузы вараць мамалыгу з малаком, кашу і інш. З кукурузнай мукі, круп і хлоп'яў народы зямнога шара гатуюць больш 62 страў: вышэйшай якасці тарты і пячэнні, паленту з сырам, тэфтэлі, хрусткія коржыкі, кекс, пудзінгі, заварное пячэнне, мятныя пернікі. Вараныя пачаткі ў малочна-васковай спеласці ядуць з маслам.

Прамысловасць вырабляе з кукурузы звыш 150 відаў прадуктаў: крухмал, спірт этылавы, спірт бутылавы, цукар, патаку, воцат, глюкозу, масла харчовае, тэхнічнае, змазачнае, кансервы, выбуховыя рэчывы, аліфу, мыла, гліцэрыну, каучук, масляныя фарбы, паперу, лакі, лінолеум, штучнае валакно і гэтак далей.

Пачаткі, убраныя ў стадыі малочна-васковай спеласці і добра засіласаваныя, роўнацэнны (па сухому рэчыву) спеламу зерню. Дакладней, 9 кг такога сіласу замяняюць 4 кг сухога зерня кукурузы або 5,4 кг аўса.

Кукурузнае зерне — дасканалы канцэнтраваны корм для жывёлы, асабліва для свіней. Пры скармліванні 4 кг сухога зерня або 9 кг кукурузнага сіласу дарослая свіння прыбывае ў вазе да 1 кг у суткі.

Ва ўмовах Беларусі пры правільнай агратэхніцы кукурузу можна сеяць усюды. З кожнага гектара можна збіраць у сярэднім па 80 — 90 ц пачаткаў у малочна-васковай спеласці або не менш 250 ц зялёных пачаткаў і сцябла. Ураджай пачаткаў з гектара па кармавых вартасцях роўны 35 — 40 ц сухога зерня, увесь-жа ўраджай — не менш 7000 кармавым адзінкам (за кармавую адзінку прынята лічыць адзін кг аўса).

Высокія ўраджаі кукурузы залежаць ад своечасовага і стараннага догляду пасеваў.

Маладыя ўсходы трэба ахоўваць ад грачоў — злейшых ворагаў кукурузы. Яны здольны знішчыць цэлыя кукурузныя палі.

Ад часу паяўлення ўсходаў і да моманту ўтварэння 3 — 5 лісцікаў на кукурузным полі з раніцы да позняга вечара павінен быць вартаўнік. Усякія іншыя мерапрыемствы, як чучалы, атрутныя прыманкі, не даюць добрых вынікаў.

Вельмі важна своечасова і старанна прарываць лішнія і кволыя расліны, каб дасягнуць роўнамернага размеркавання пасеваў па ўсёй плошчы жыўлення. Прарыўку пачынаюць, калі ў большасці раслін утвараецца 3 — 4 лісцікі. Калі гатунак кукурузы высокарослы, то ў кожным гняздзе пакідаюць па дзве, а калі сярэдняга росту, то па тры расліны.

Як толькі абазначацца радкі ўсходаў, пачынаюць першую культывацыю ў прадоўжным напрамку на глыбіню 10 — 12 сантыметраў, а праз 4 — 5 дзён — у папярочным напрамку на тую-ж глыбіню.

Адной з асаблівасцей агратэхнікі кукурузы з'яўляецца старанны догляд яе на працягу ўсяго вегетацыйнага перыяду. Вопыт калгаса імя Калініна Хойніцкага раёна паказаў, што пры двухразовай прадоўжна-папярочнай апрацоўцы глебы ў міжраддзях ураджай зерня кукурузы не перавышаў 18 ц і зялёнай масы 250 ц з гектара, пры трохразовай апрацоўцы — адпаведна: 32 ц і 397 ц, а пры чатырохразовай — 56 ц і 485 ц.

Пры летняй апрацоўцы глебы глыбіня міжраддзяў павінна быць рознай. Першая апрацоўка робіцца на глыбіню 10 — 12 см, а кожная наступная змяншаецца на 2 см. Калі не даглядаць пасеваў, то глеба ўшчыльняецца, зарастае пустазеллем, карэнні кукурузы размяшчаюцца на глыбіні 3 — 5 см ад паверхні глебы і пры наступных міжрадковых апрацоўках пашкоджваюцца. Правільны і своечасовы догляд паляпшае фізічныя ўласцівасці глебы, павышае тэмпературу на глыбіні развіцця каранёвай сістэмы. Утрыманне поля ў рыхлым і чыстым выглядзе садзейнічае магутнаму развіццю каранёвай сістэмы, а значыць і развіццю ўсёй расліны. На сярэдніх суглiністых глебах міжрадковае рыхленне кукурузы трэба праводзіць праз кожныя 12 — 13 дзён ад з'яўлення ўсходаў і да поўнага змыкання раслін у радках.

Вельмі важна таксама своечасовая падкормка раслін. Азотныя, фосфарныя і калійныя ўгнаенні вельмі павялічваюць ураджай як зерня, так і ўсёй зялёнай масы. Першую падкормку азотнымі і фосфарна-калійнымі ўгнаеннямі з разліку адзін цэнтнер аміячнай салетры, адзін цэнтнер суперфасфату і адзін цэнтнер калійнай солі на кожны гектар неабходна праводзіць праз 5 — 7 дзён пасля прарыўкі раслін. Другую падкормку праводзіць толькі фосфарна-калійнымі ўгнаеннямі па аднаму цэнтнеру на гектар у перыяд, калі расліны дасягнуць 40 — 50 см або перад выкіданнем мяцёлак. Для першай падкормкі можна выкарыстаць і фекалій. Падрыхтаваць тону свежага каравяку і пасля трохдзённага браджэння растварыць у сямі частках вады. Уносіць у глебу жыжкападкормачнымі машынамі.

На кукурузе сустракаюцца два віды галаўні: пузырыстая і пыльная. Пузырыстая галаўня паражае часам да 15 прац. раслін у перыяд іх росту і развіцця. Споры пузырыстай галаўні зімуюць галоўным чынам у глебе і ў саломе, а летам разносяцца па палях кукурузы. На заражаных галаўнёю раслінах утвараюцца розных памераў уздуцці. Пры паспяванні кукурузы яны растрэскваюцца, і чорныя споры пераносяцца ветрам і паражаюць іншыя расліны. Гэтага нельга дапускаць. Трэба адразу-ж зразаць уздуцці з раслін, акуратна збіраць іх у вядро, выносіць з поля і закопваць у зямлю на глыбіню 40 — 50 см. Пасля зрэзу кожнага ўздуцця трэба выціраць нож і рукі газай або растворам фармаліну, каб не пераносіць заразу.

Кукуруза вельмі добра апыляецца. Але ўмовы надвор'я не заўсёды спрыяльны для апылення. У дажджлівае надвор'е ў паветры бывае мала пылку, у сухое гарачае надвор'е ён хутка траціць жыццездольнасць. Таму рэкамендуецца практыкаваць штучнае апыленне. Для гэтага пылок з мяцёлкі страсаюць з дапамогай асцярожных удараў па раслінах вяроўкай. Два чалавекі, трымаючыся за канцы 3 — 5-метровай вяроўкі, злёгку прыгінаюць ёю расліны. Пылок разлятаецца ў паветры і трапляе на рыльца жаночых кветак. Апыленне трэба рабіць раніцай і ў бязветранае надвор'е, каб пылок не зносіўся ветрам у бок. Шматлікія назіранні паказалі, што ў выніку дадатковага апылення кукуруза ў 2 — 3 разы менш паражаецца хваробамі, асабліва пузырыстай галаўнёй, і дае штогод прыбаўку зерня па 5 — 6 ц на гектар.

**С. І. ЦІШКОЎ,**
кандыдат сельскагаспадарчых навук.



У мінулым годзе звяно па вырошчванню кукурузы з калгаса імя Вярхоўнага Совета (Лідскі раён Гродзенскай вобласці) атрымала па 800 ц зялёнай масы і па 30 ц пачаткаў з гектара.

У звяне комсамолкі Анціі Шымуль 8 чалавек. Усе яны працуюць добра, дружна. Сеялі кукурузу квадратна-гнездавым способам па добра апрацаванай глебе. Як толькі з'явіліся ўсходы, унеслі ўгнаенне — торфа-перагнойны кампост з разліку па 15 ц на гектар. Кампост клалі ў кожнае гняздо. Пасля праполкі падкармлівалі салетрай і суперфасфатам па 50 кг на гектар. Кукуруза вырасла вышынёй у 2,5—3 метры. Сёлета звяно засее 13 гектараў кукурузы.

Слава аб знатнай звеннявой Анціі Шымуль, якая вырасціла ў нечарназёмнай паласе такі багаты ўраджай кукурузы, разнеслася далёка за межамі Беларусі.

На здымку: Анція Шымуль аглядае кукурузу, вырашчаную ў мінулым годзе.

Фото Г. Ткачэнкі



З. М. Тусналобава з сынам.

# МУЖНАСЦЬ

**Алена ВАСІЛЕВІЧ**

*9 мая гэтага года спаўняецца 10 год з дня гераічнай перамогі Савецкай Арміі над фашызмам у Вялікай Айчыннай вайне.*

*Вялікі ўклад унеслі савецкія жанчыны-патрыёткі ў гэтую перамогу.*

*Ніжэй змяшчаецца нарыс аб адной з удзельніц вялікай перамогі — Зінаідзе Міхайлаўне Тусналобавай.*

З ПАЖОЎКЛАЙ газетнай паласы глядзіць мілы дзявочы твар. Бесклапотная ўсмешка кранула вусны, адбілася ў поглядзе вясёлых вачэй. Завіўка, белы каўнерык на плацці — усё такое звычайнае і ў той-ж час да болю блізкае, знаёмае, роднае: юнацтва!

Адрываешся ад гэтага прыгожага маладога твару, чытаеш пажоўклыя газетныя радкі:

«Рускія людзі! Салдаты! Я была вашым таварышам, я ішла з вамі ў адной шарэнзе... Мне 23 гады. Пятнаццаць месяцаў ужо ляжу я, прыкаваная да шпітальнай койкі. У мяне цяпер няма ні рук, ні ног. Гэта зрабілі фашысцкія каты... Я прашу вас, адпомсціце за мяне, за мой родны Полацк! За нашу знявечаную зямлю, за нашу растаптаную маладосць!»

Гэты зварот камсамолкі Зінаіды Тусналобавай да воінаў 1-га Прыбалтыйскага фронта з'явіўся ў газетах 13 мая 1944 года, тады, калі войскі гэтага фронта рыхталіся штурмаваць Полацк, а сама Зіна знаходзілася ўжо ў Маскоўскім інстытуце пратэзавання.

Недзе далёка, далёка, ззаду застаўшыміся, здаваліся пражытыя 23 гады... Уперадзе чакала зусім іншае... Толькі цёмныя ночы і мокрая ад слёз падушка былі сведкамі таго, як цяжка спачатку зразумець, а потым паверыць у тое, што жыццё патрэбна, што будаваць яго неабходна так, каб «не пякла ганьба, каб не сорам было за маленькае і дробненькае мінулае...»

Гісторыю гэтага жыцця можна назваць адным вычарпальным словам — подзвіг.

Я раскажу гэту гісторыю, ні слова не дадаючы ад сябе, не ўпрыгожваючы, не ўзвялічваючы: яна ў гэтым не мае патрэбы.

Зіна Тусналобава нарадзілася ў 1920 годзе ў Полацку. Калі ёй было гадоў дзесяць, сям'я пераехала ў Кузбас. Там Зіна вырасла, там і пазнала ўсё багацце радасцей, якімі так шчодра надзяляе чалавека юнацтва.

Зіна працавала лабаранткай у хімічнай лабараторыі аднаго з буйнейшых трэстаў. Любіла сваю работу і, як натура актыўная, дзейная, гуртавала заўсёды вакол сябе моладзь. Апошнія два гады перад вайной яна была сакратаром камсамольскай арганізацыі.

Тады-ж, сустрэўшыся з Іосіфам Марчанка, пазнала Зіна ўсю глыбіню вялікага дзявочага шчасця, усім сэрцам адгукнулася на заклік другога сэрца.

За тры месяцы да вайны яна стала жонкай Іосіфа Марчанкі.

А потым грымнула вайна.

На другі дзень пайшла Зіна ў ваенкамат з просьбай узяць яе ў армію сандружынніцай. Аднак ёй адмовілі. Тады яна пайшла на трохмесячныя курсы медсясцёр і скончыла іх. Яе ўзялі ў стралковае злучэнне.

Першае баявое хрышчэнне Зіна прыняла ў чэрвені 1942 года пад Варонежам. За першыя тры дні яна вынесла з поля бою 40 раненых байцоў. За гэтыя баі Зіна была ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Звязды. Тады-ж, пад Варонежам, яна ўступіла ў рады Комуністычнай партыі. Тут атрымала званне старшыні медыцынскай службы.

Затым дарога вайны павяла Зіну і яе таварышаў-аднапалчан далей... Восем месяцаў прабыла яна на перадавой, сама дзівячыся, як мінавалі яе варожыя кулі. А колькі сяброў, колькі таварышаў па зброі за гэты час засталося ляжаць на залітых крывёй палях Радзімы!

За восем месяцаў Зіна вынесла 123 параненых байцоў.

У студзені 1943 года быў адбіты ў ворага Варонеж. Савецкія часці адбівалі раён за раёнам у Курскай вобласці.

Пад сялом Ніжне-Давідск часць трапіла ў акружэнне. Жменька

байцоў, што засталіся жывыя, вытрымала апошні бой каля станцыі Гаршчэчная. Зіна Тусналобава, бачачы, што паранілі камандзіра роты, кінулася яму на дапамогу. У гэты момант разрыўная куля перабіла ёй абедзве нагі.

Гітлераўцы ішлі ў контратаку. Тых, хто яшчэ заставаўся жывы, дабівалі прыкладамі па галаве. Спешна абшуквалі кішэні забітых, зрывалі з рук гадзіннікі, забіралі ножыкі, партсігары — усё, чым можна было пажывіцца ў салдата...

... Цяжкі бот з усёй сілы стукнуў у бок, і Зіна, якая прыкінулася было мёртвай, не вытрымала, застагнала. Тады на яе галаву абрушыліся ўдары прыклада: адзін, другі, трэці...

Яна не бачыла пунсовай вячэрняй зары, не адчувала, як мароз прыкоўваў яе да зямлі, як буйнымі журавінамі студзіў кроплі гарачай крыві і рассыпаў іх па снезе.

Свядомасць вярнулася толькі на другія суткі. Ногі ў набухшых ад крыві і прымёрзшых да зямлі валёнках нельга было скрануць з месца, прыкіданыя снегам рукі і твар былі абмарожаны...

Страшэнна не хацелася паміраць... Жыць! Жыць! Гэтага прагнула ўся яе істота.

Вечарам Зіна пачула аддаленыя крокі, потым родную мову — усё бліжэй і бліжэй. Пачала клікаць, што было сілы. Нашы разведчыкі знайшлі яе і прынеслі на перавязачны пункт. Пасля першай дапамогі пайшлі адна за другой восем аперацый.

Зіне ампутавалі абедзве нагі, правую руку і кісць левай рукі...

Што засталося ў жыцці і навошта яно такое жыццё ў 23 гады?

Гэтая думка не пакідала Зіну. Яна не магла пазбавіцца яе, нягледзячы ні на ўгаворы сяброў, ні на ўгаворы старых дактароў, якім усяго давялося пабачыць за свой век.

У Свердлоўскім шпіталі нехта з сяброў прынёс і непрыкметна пакінуў кнігу Мікалая Астроўскага «Як гартавалася сталь».

«Зноў суцяшэнне. Яны думаюць, што мяне можна суцешыць ці пераканаць»... І ўсё-ж жаданне перачытаць кнігу, якая некалі так глыбока запала ў сэрца, перамагло. І Зіна перачытвала яе, перагортваючы старонкі языком...

Нямала думак было перадумана за шэсць месяцаў нерухавага ляжання на спіне. Паступова вярочаліся сілы, а разам з імі жаданне жыць. Жыць і быць карыснай — усё больш акрэсленай рабілася жыццёвая мэта.

У гэты час у Зіны было ўжо многа сяброў: яе наведвалі рабочыя фабрык і заводаў, студэнты, старыя прыяцелі.

Танкавы завод у гэты час пабудаваў пяць танкаў імя Зінаіды Тусналобавай. Яе імем былі названы самалёт, які адразу з варот завода накіраваўся на фронт.

Перад Зінай стаяла зараз неадкладная задача: падначаліць сабе жыццё і перш за ўсё навучыцца пісаць. У гэтым дапамог ёй прафесар-хірург Свердлоўскага шпіталя Сакалоў. Карыстаючыся спецыяльнай манжэткай, Зіна адпісвала ўжо ўсім сваім карэспандэнтам сама, выклікаючы іх недавер'е і захапленне. Першая вышыня была пераадолена.

Другая вышыня — навучыцца хадзіць — была не менш складанай.

І калі зажылі раны, у канцы 1943 года, Зіну накіравалі ў Маскоўскі інстытут пратэзавання. У Маскве, як і ў Свердлоўску, у Зіны хутка знайшліся блізкія сардэчныя сябры.

У інстытуце ў жыцці Зіны адбылася яшчэ адна знамянальная падзея: наладзілася сувязь з мужам.

Страшэнна перажываючы, яна ў першым-жа пісьме не скрыла ад мужа жорсткай праўды:

«Я не хачу быць на тваім шляху перашкодай. Пішу табе аб усім, не адкладаючы... Памятай, што я не жадаю звязваць цябе ў далейшым і паўтараю табе: наладжвай сваё жыццё так, быццам мяне на тваім шляху ніколі не было»...

Пакуль ішоў адказ, зноў былі бяссонныя ночы, і слёзы, і адчай. Нарэшце, вось ён, праштампаваны вайной белы трыкутнік з такім знаёмым, такім родным почыркам...

І вось пісьмо распячатана.

«Мілая, родная, любімая!» Сэрца так моцна забілася ў грудзях, што, здавалася, разаб'ецца ў сваёй цеснай клетцы.

Доўга трымала яна гэты трыкутнік, прыцісьнуўшы яго да грудзей і заплюшчыўшы вочы, быццам хочучы пачуць мілы голас. І паўтарала шэптам тры словы: «Мілая, родная, любімая!..»

«Ты мая, што-б з табою ні здарылася! Я чакаю цябе».

Значыць ён кахаў, ён чакаў!

Якім прыгожым, якім поўным, якім неабходным зрабілася з гэтага дня жыццё для Зіны.

* * *

У Полацку над шырокаю кручай Дзвіны стаіць дом. Раніцай з двара, моцна тупаючы па дошках тратуара, выбягае хлопчык гадоў чатырох. Вясёлыя вочкі яго ўмомант агледаюць усё, што робіцца на вуліцы. Азіраючыся, хлопчык моцна гукае:

— Бабуся, глядзі — шпакі прыляцелі!

— А хіба не пара ім прыляцець? Бач, як вясна запазнілася, — недзе за брамкай заўважае бабуся і, выходзячы на вуліцу, падае ўнуку руку.

— Глядзі не паслізніся, унучак, а то паляціш так, як і я ўчора...

— Ты, бабуся, старая, — не заўважае рукі хлопчык, — а я ўжо вялікі.

Ля брамкі стаіць са шчаслівай усмешкай жанчына.

— Асцярожна, сынку, не ўпадзі, — як усё маці на свеце, настаўляе яна, любуючыся сынам: такі ён прыгожы і моцны. Хіба скажаш, што яму ўсяго чатыры гады? Мужчына!

Злёгку раскачваючыся і паскрыпваючы пратэзамі, яна ўзнімаецца на ганак. Сына адправіла ў дзіцячы сад, зараз трэба адпраўляць на работу мужа.

Гэта Зінаіда Міхайлаўна Тусналобава.

... Даўно адгрымела вайна, даўно вярнуліся да мірных спраў людзі, звілі свае гнёзды, гадуюць дзяцей.

Цудоўны хлопчык расце ў сям'і Зінаіды Міхайлаўны і Іосіфа Пятровіча Марчанка. Вове ўжо чатыры гады. Ён найвялікшая ўцеха ў бацькоў і бабулі.

Іосіф Пятровіч паехаў у камандзіроўку, а бабуля якраз руку вывіхнула. І вось за «мужчыну» застаўся ў доме Вова.

Маці накладае яму невялікія паленцы, і ён ахвотна носіць іх у хату. Так і нанасіў дроў, што хопіць выпаліць у печы.

Жыццё Зінаіды Міхайлаўны, да якога яна так прагна імкнулася, перамагаючы нечалавечыя цяжкасці, не абмяжавалася сямейным колам. Яна вядзе вялікую перапіску са старымі франтавымі і шпітальнымі сябрамі. Ёй пішуць з рэдакцый, з музеяў. Цёплую перапіску вядзе яна з жонкай і сястрой Мікалая Астроўскага. У сочынскім музеі Н. Астроўскага знаходзіцца партрэт Зінаіды Тусналобавай з подпісам:

«Я веру, што здолею быць карыснай Радзіме».

Як самую дарагую рэліквію, захоўвае Зінаіда партрэт Мікалая Астроўскага, падараваны яго жонкай і сястрой у дні пяцідзесяцігоддзя пісьменніка-байца.

... Зінаіду Міхайлаўну просяць напісаць для піянераў, выступіць перад дзетдомаўцамі, расказаць пра сваё жыццё маладым салдатам.

І яна ўсюды піша, усюды едзе, усюды выступае.

Жыццё яе, загартаванае ў страшэнных выпрабаваннях, натхняе, захапляе, вучыць берагчы і адстойваць мір на зямлі.




# Калі збываюцца мары

(Па старонках часопісаў краін народнай дэмакратыі)

НАПЯРЭДАДНІ святкавання дзесятай гадавіны вызвалення Румынскай Народнай Рэспублікі ў Інфармацыйным бюлетэні камітэта дэмакратычных жанчын было апублікавана пісьмо Мітаны Поп, работніцы бухарэсцкай фабрыкі імя Паўло Ткачэнка, да Зоі Раманаўны Ефімавай — работніцы Іванаўскага меланжавага камбіната. Пісьмо гэтае, напісанае ад усяго сэрца савецкаму сябру, — яркі дакумент, які расказвае аб мінулым і сучасным простай румынскай жанчыны. Яго нельга чытаць без глыбокага хвалявання.

«Мне яшчэ не было 12 год, калі я паступіла на панчошнавязальную фабрыку. З гэтага дня я перастала быць дзіцем,— піша Мітана Поп. — Працаваць прыходзілася нароўні з дарослымі работніцамі, і нярэдка, калі мяне душыла гора і міжволі праймалі слёзы, майстар браўся мяне «лячыць». Ну, і цяжкая-ж была ў яго рука!»



Балгарыя. Знатная савецкая працаўніца Лідзія Карабельнікава перадае свой вопыт рабочым абутковай фабрыкі імя 9-га верасня.

Пазней яна вышла замуж за рабочага фабрыкі. З'явіліся дзеці. Яны жылі ў цёмным маленькім пакойчыку, раслі без цяпла і святла.

Яшчэ больш нязносным стала жыццё, калі пачалася вайна. Мужа забралі на фронт. Мітана засталася без работы: гаспадар закрыў фабрыку.

23 жніўня 1944 года — радасны дзень вызвалення Румыніі ад фашысцкага ярма — самы дарагі, самы памятны дзень у жыцці Мітаны.

«Седзячы яшчэ ў сховішчы, — піша яна, — я пачула крыкі: «Ідуць савецкія!..» Я ўзяла дзяцей за рукі, і мы пабеглі іх сустракаць. Калі ўбачыла першага савецкага байца, я міжволі заплакала ад радасці.

Адзін з савецкіх байцоў, высокі і светлавалосы, узяў майго малодшага на рукі і высока падняў яго. І я зразумела, што ў яго таксама засталіся дома дзеці і што ён сумуе па іх».

Мінулыя 10 год унеслі велізарныя змены ў жыццё гэтай простай рабочай сям'і. За гэтыя гады Мітана Поп стала адной з лепшых работніц, навучылася майстэрству. Шчаслівая яна, яе муж і дзеці, якія выйшлі на шырокую дарогу жыцця. Яна добра разумее, каму абавязана сваім шчасцем. Гарачая ўдзячнасць савецкаму народу гучыць у яе словах:

«Усё, аб чым я пішу, ніколі не збылося-б без Вашай дапамогі. Часта, калі ў вольны час я гуляю са сваімі дзецьмі ў парку, я спыняюся перад помнікам савецкаму байцу і нагадваю ім: «Бачыце? Шмат такіх байцоў паклалі свае жыцці за тое, каб нам жылося лепш, каб вы вучыліся ў школе, радаваліся жыццю. Не забывайце гэтага, родныя, усё сваё жыццё».

На здымку зверху: Кітайская Народная Рэспубліка. Калгас «Сіньхуо». Трактарысткі Кін Дэк-хан (злева) і Пак Ен-за перад пачаткам работы.

* * *

Радасць новага жыцця пазналі мільёны і мільёны жанчын краін народнай дэмакратыі. У Жэрані, поўночным раёне Варшавы, знаходзіцца першы ў Польшчы завод легкавых аўтамабіляў. У гэтым многатысячным калектыве, як і ва ўсёй прамысловасці Польшчы, шмат жанчын. Яны авалодваюць прафесіямі зваршчыка, токара, мантажніка, майстра. Усе гэтыя прафесіі ў капіталістычнай Польшчы былі для іх недаступны. Народны ўрад і Польская аб'яднаная рабочая партыя праяўляюць аб жанчынах бацькоўскія клопаты. Іх дзеці выхоўваюцца ў яслях і дзіцячых садах, работніцам створаны ўсе ўмовы для здаровага адпачынку.

Работніца аўтазавода Соф'я Флыста атрымала пуцёўку ў санаторый. Адпачывала яна там разам з дзецьмі. У часопісе «Польскі прафсаюзны агляд» прыводзіцца яе пісьмо ў заводскі совет.

«Дарагія таварышы! — піша яна. — Я вельмі ўдзячна вам за тое, што вы далі мне магчымасць правесці адпачынак разам з дзецьмі. Тут дасканала. Цудоўныя сасновыя лясы, зручная кватэра, смачнае харчаванне. Тут адпачываюць 63 маці з дзецьмі. Я адпачываю вельмі добра і вярнуся да вас з новым запасам сіл.

Соф'я Флыста».



Польшча. У дазіровачным цэху фабрыкі пеніцыліну ў Тархоміне.

* * *

Перамога вялікай народнай рэвалюцыі ў Кітаі прынесла вызваленне працоўным жанчынам ад спрадвечнай няволі. Назаўсёды мінулі для жанчыны часы падвойнага ўціску: зверскай эксплуатацыі памешчыкамі, гаспадарамі фабрык і заводаў, і сямейнай няволі, калі і свёкар, і свякруха, і муж здзекаваліся над яе чалавечай годнасцю. Комуністычная партыя і народны ўрад Кітая ўцягнулі мільёны жанчын у будаўніцтва новага жыцця, пасялілі ў іх веру ў свае сілы. І якая гэта аказалася велізарная сіла!

У жніўні мінулага года Чэнь Хун-чжы — стругальшчыцу Шыцзіншаньскага сталеліцейнага завода — накіравалі на вучобу ў Пекінскі металургічны тэхнікум. Спачатку было вельмі цяжка: не мела адпаведнай падрыхтоўкі. Але жаданне вучыцца, дапамога выкладчыкаў і таварышаў зрабілі сваю справу. «Я дала сабе слова вучыцца на выдатна і стаць добрым тэхнікам», — піша Чэнь Хун-чжы ў часопісе «Кітай» № 1 за 1955 год.

Цікавыя факты актыўнага ўдзелу жанчын новага Кітая ў кіраванні краінай прыводзіць у сваім артыкуле (нумар пяты часопіса «Народны Кітай») Цзо Сун-фэнь.

У верасні мінулага года ў Пекіне адбылася першая сесія Усекітайскага Сходу народных прадстаўнікоў — вярхоўнага органа ўлады. У рабоце сесіі прынялі ўдзел 147 жанчын — лепшых дачок кітайскага народа, якім аказана найвялікшае давер'е і пашана.

Дэпутат Кан Цзюй-ін да вызвалення краіны была батрачкай у памешчыка. Цяпер яе не пазнаць. Яна выбрана старшынёй сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва ў правінцыі Хунань.

Яшчэ зусім нядаўна дэпутат Сунь Сяо-цзюй была непісьменнай. У 1948 годзе пачала працаваць на станцыі Цыцыкар спачатку білетным кантралёрам, затым сувязісткай і нарэшце дыспетчарам (першы дыспетчар-жанчына ў краіне). Нядаўна яе перавялі ў памочнікі старшага дыспетчара. Так паступова авалодвала яна складанай кваліфікацыяй чыгуначніка.



Румынія. Шэйтан Мар'я, старшыня калектыўнай сельскай гаспадаркі імя Хрыста Боцева Галацкай вобласці, карыстаецца любоўю і павагай усіх сялян—членаў калектыўнай гаспадаркі— за працавітасць і ўменне, з якім яна арганізуе і кіруе іх работай.

Аб велізарнай палітычнай актыўнасці жанчын новага Кітая сведчыць і той факт, што сярод дэпутатаў нізавых органаў улады 981 229 жанчын. Вялікая, унушальная лічба! Гэта людзі, якія толькі пры народнай уладзе адчулі сябе гаспадарамі свайго лёсу.

* * *

...Усё мацней гучыць голас жанчын краін народнай дэмакратыі. Нядаўна ў чэхаславацкай вёсцы Лідзіца адбылася канферэнцыя жанчын — актыўных барацьбітоў за мір. Хто не памятае жудаснай гісторыі гэтай вёскі? У час другой сусветнай вайны фашысцкія каты па-варварску знішчылі Лідзіцу. Усіх мужчын расстралялі, а жанчын адправілі ў канцэнтрацыйныя лагеры. У маці забралі дзяцей і многіх спалілі ў газавых камерах. Цяпер на месцы руін узнікла новае, цудоўнае сяло. На канферэнцыю ў Лідзіцу з'ехаліся прадстаўніцы жанчын-маці ўсёй рэспублікі. Яны пакляліся аддаць усе свае сілы барацьбе за мір, каб ніколі не паўтарылася трагедыя гэтай вёскі, і звярнуліся да маці Францыі і Германіі з заклікам смела выступіць супроць злачынных планаў падпальшчыкаў вайны.

Анежка Гадзінава-Спурна — старшыня Чэхаславацкага камітэта абароны міру і намеснік старшыні Нацыянальнага сходу — ў 3 нумары часопіса «Чэхаславакія» піша:

«Лідзіцкай канферэнцыяй у нас пачалася кампанія падрыхтоўкі да Усесаюзнага кангрэсу маці. Мы хочам, каб кожная маці ўсвядоміла, што прадухіліць вайну можна, што толькі вялікая сіла аб'яднанага лагера міру можа сарваць планы падпальшчыкаў вайны. Мы хочам, каб кожная маці адчувала непасрэдную адказнасць за справу міру, каб кожная маці зразумела, што забеспячэнне мірнага жыцця для яе ўласнай сям'і неаддзельна ад забеспячэння міру ва ўсім свеце».

9 мая спаўняецца 10 год з дня перамогі совецкага народа над гітлераўскімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта свята не толькі совецкага народа, але і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва.

Разам са сваімі народамі жанчыны краін народнай дэмакратыі ніколі не забываюць, што ажыццявіць іх самыя светлыя, самыя запаветныя мары дапамаглі і штодзённа дапамагаюць ім народы Совецкага Саюза. Вось чаму на ўсіх мовах гучаць словы любві і прывітання нашай вялікай айчыне.

КАЛІ пры ўездзе ў Камянец павярнуць направа, вачам адкрываецца сядзіба МТС, а пры бальшаку, сярод старых дамоў, блішчыць свежым бярвеннем новы зруб.

— Гэта наша Мар'я будуецца, — тлумачыць адзін з работнікаў МТС. — Я з гэтага і пачаў-бы пісаць пра яе... Маладая дзяўчына, брыгадзір трактарнай брыгады, будуе прасторны дом, значыць жыве ў дастатку, а дастатак ад працы прыйшоў.

З такой прапановай нельга было не пагадзіцца.

Таму пры першым спатканні я адразу-ж спытала, калі будзе навасёлле.

Мар'я крыху збянтэжылася:

— Я вельмі хацела-б навасёлле справіць, ды не магу лес атрымаць.

— Колькі-ж там лесу патрэбна? Дом амаль гатовы — засталося накрыць, дзверы, вокны паставіць.

Маруся яўна не зразумела, у чым справа.

— Леташняй вясною мне давалі будматэрыял, дык грошай не было. Да восені я выпрацавала 1106 працадзён, грашыма па 7 руб. атрымала, збожжа 156 пудоў, тады ўжо і лесу не стала.

— А дом усё-ж вырас?

— Гэта не мой дом, — рассмяялася Маруся. — Сястра будуецца, а я з бацькам дапамагаем.

Шкада, што дом аказаўся не Марусі, але радасна было ўжо тое, што ўсё-ж дачка Каранчука будуецца. Таго самага Аксёна Каранчука, які пры панах усё жыццё прабатрачыў. Ні яму, ні жонцы яго ў маладосці не давялося ў добрым доме жыць. А вось дочкі будуць жыць, таму што аб іх клапоціцца савецкая, народная ўлада. Недалёка дзень, калі і Мар'я атрымае лес на будаўніцтва, а там і меншая, Вольга, будзе думаць пра свой дом...



Мар'я (злева) і Вольга Каранчук.

Фото В. Германа (Фотахроніка БелТА)

# Сёстры

Не хацеў Каранчук, каб яго дочкі працавалі на трактары. Але Мар'я аказалася непахіснай і цвёрда вырашыла «асядлаць сталёвага каня».

У 1950 годзе Мар'я паехала ў Брэст, хацела паступіць у школу механізацыі, але вярнулася засмучоная: не прынялі. Спазнілася.

Усё-ж Маруся не пакінула думкі аб трактары. Паехала ў Камянецкую МТС, дзе адкрыліся курсы, і праз тры месяцы працавала ўжо трактарысткай.

Калгаснікі, сустрэўшы яе бацьку, часта гаварылі:

— Бачылі, Аксён, тваю дачку на трактары. Сядзіць, нібы хлапчына.

Параўнанне з хлопцам зусім не пасуе Марусі. З выгляду яна невысокая, са стройнай фігуркай і яркім румянцам на шчоках. Але характару яе можа пазайздросціць, бадай што, любы хлопец. У дзяўчыны адчуваецца ўнутраная сабранасць, вялікая сіла волі, настойлівасць і ўменне прымусіць людзей слухацца. Гаворыць яна мала і заўсёды разважліва. Калі расказвае пра работу брыгады, здаецца, што перад табой чалавек з вялікім жыццёвым вопытам. Але варта гэтаму чалавеку ўсміхнуцца, як вочы адразу ўспыхнуць вясёлымі зоркамі, а тварык стане па-дзявоцку мілым і далікатным...

К канцу першага года работы яе прызначылі брыгадзірам. Цяжка давялося: трактары больш прастойвалі, чым працавалі, план не выконваўся, у трактарыстаў не відаць было стараннасці. Але выключная працавітасць і ўпартасць Марусі моцна падцягнулі брыгаду.

Не шкадуе цяпер Аксён Каранчук, што Мар'я пайшла ў механізатары. Не стаў ён адгаварваць і меншую дачку, калі тая таксама паступіла ў школу механізацыі. Бачыць цяпер бацька, што дочкі пайшлі па правільным шляху.

У тыя дні Маруся рэдка бывала дома. Часцей са сваёй брыгадай жыла ў калгасе «Кастрычнік». Але калі ёй траплялася заехаць дамоў, Вольга больш за ўсіх радавалася сустрэчы з сястрой. Яна цікавілася ўсімі падрабязнасцямі яе работы.

— А каб завесці трактар, ці шмат трэба сілы? — пытала яна.

— Ты што-ж, сваю сілу хочаш выпрабаваць? — смяялася Маруся.

— Калі трактар спраўны, матор уключаецца лёгка. Не хвалюйся, сястрычка, сілы ў цябе хопіць. Вось з граматай будзе цяжэй.

Часта Вольга думала над прафесіяй сястры і ўрэшце вырашыла:

— Я таксама буду трактарысткай!

Аднойчы Маруся абрадавала сястру:

— Ведаеш, мяне пасылаюць на брыгадзіра вучыцца.

— Еду з табой! — цвёрда заявіла Вольга.

Абедзве сястры паступілі ў школу механізацыі. Марусі было лягчэй: яна ўжо ведала трактар, а з тэорыяй крыху на курсах знаёмілася. А Воля не раз над кнігамі плакала. Тады сястра дзялілася сваімі ведамі. На экзаменах Воля амаль усе прадметы здала на добра.

Вялікая дружба сясцёр не спынілася з заканчэннем вучобы. Вольгу залічылі ў брыгаду сястры трактарысткай. Яны і цяпер дапамагаюць адна другой у рабоце. За апошні час брыгада амаль падвоілася і лічыцца адной з перадавых у МТС.

Аб Мар'і і Вользе ідзе добрая слава. Мар'ю нядаўна выбралі дэпутатам раённага Савета дэпутатаў працоўных.

... Вясна на Брэстчыне сёлета спазнілася. Толькі 3 красавіка трактары выехалі ў калгасы «Перамога» і «Кастрычнік». Брыгадзір разам з памочнікам Іванам Кузько распрацавалі графік на кожны трактар.

— Без дакладнага графіка нельга, — гаворыць Маруся. — Мы павінны пасеяць каля 800 гектараў, а часу мала.

... У прамасленым камбінезоне, у кірзавых ботах Вольга выглядае падлеткам. Але трактар паслухмяны ёй, як і спрактыкаванаму майстру С. І. Рахлею. Дарэчы, яны абодва ўзнагароджаны значком «Выдатнік сацыялістычнай сельскай гаспадаркі».

— Вольга маладзей і гадамі і вопытам работы, — гаворыць старшы трактарыст, — а за рулём дагнала мяне. Леташні план выканала на 174 працэнты.

Назіраючы, як Вольга спрытна разварочвае машыну, Сяргей Іванавіч працягвае:

— З ёй прыемна працаваць: яна любіць трактар і цікавіцца ім.

Са скромнасці ён не гаворыць, што сам ён таксама любіць гэтую разумную машыну, што і сам шукае шляхі для павелічэння яе прадукцыйнасці.

... Раптам гучны рокат сціх, трактар спыніўся, цяжка дыхаючы.

— Сеялкі заправіць! — поўжартуючы, скамандавала Воля прычэпшчыкам і выйшла з кабіны.

Ад вёскі паказаўся веласіпедыст.

— Камандзір едзе! — заўважылі прычэпшчыкі.

Камандзірам яны называюць Марусю, укладваючы ў гэтае слова сваю павагу да дзяўчыны-брыгадзіра. І сапраўды гэта была Маруся.

— Як ідуць сеялкі? — пацікавілася яна ў Вольгі.

— Добра, учора 30 гектараў засеяла, а сёння не менш 34 будзе. А што? — ужо з трывогай спытала Вольга.

— А тое, што Кучур прастаяў больш гадзіны, — сурова сказала Маруся. — Не дагледзеў, як шасцерні выпшарбіліся. Улічы, каб і ў цябе падобнага не здарылася.

— Улічу. А ты таксама ўлічы, што сёння ўвечары заняткі гуртка кройкі і шыцця. Не пазніся, — папярэдзіла Вольга.

— Сёння? Вось добра, Волечка, што напомніла. Прыйду...

Сеялкі былі запраўлены. Маруся пачакала, пакуль трактар крануўся з месца і пацягнуў за сабой увесь агрэгат...

Усе трактары ў брыгадзе працуюць кругласутачна з прыпынкам на тэхагляд.

— Перад пачаткам змены, — расказвае Маруся, — трактарысты правяраюць спраўнасць машыны. Інакш нельга. Не дагледзіш — прастой. А ў нас, апрача абавязацельстваў перад калгасам, ёсць абавязацельствы ў сацыялістычным спаборніцтве.

Яна гаворыць аб гэтым без выхвалення. І гэта сапраўды так, таму што для савецкага рабочага соцыялістычнае спаборніцтва стала неабходнасцю.

Брыгада Варанчук увесь час спаборнічае з трактарыстамі Бакуна і кожны год дабіваецца добрых паказчыкаў. Летась брыгада перавыканала план на 20 прац. і сэканоміла 2 196 кг. гаручага. Трактары працавалі без прастояў.

Дружба і арганізаванасць трактарыстаў брыгады Варанчук дапамагаюць у рабоце. Яна ўжо чатыры гады кіруе брыгадай і амаль забыла свае сумненні, трывогі, калі ёй даручылі брыгаду. Але не забыць ёй дня, калі камуністы МТС абмяркоўвалі пытанне: ці заслугоўвае Мар'я Варанчук высокага звання члена Камуністычнай партыі.

Сёстры Варанчук выбралі правільны шлях у жыцці — шлях сумленных працаўнікоў. Тут яны заслужылі славу і павагу, тут знайшлі і поўны дастатак, якога не мела раней сям'я Аксёна Варанчука.

**С. ПЛОТНІКАВА.**

Камянецкая МТС
Брэсцкай вобласці.

## Вясеннім ранкам

Пераклічка крылатых
гасцей над прасторам
Пачынаецца з золаку
ранкам вясновым
І ў блакіце нябёс
разліваецца хорам,
Над рунеючай нівай
і гаем сасновым.

А раўчук неўгамонны
разносіць наўкола
Ганарлівы свой кліч
франтавога гарніста,
З баявой падрыхтоўкаю
выйшлі у поле,
У наступленне на новы
ўраджай трактарысты.

Хлебаробы за імі,
як тыя салдаты,
Выйшлі з песняю ў поле,
у раннюю просінь,
Рассяваць па раллі
залатыя зярняты,
Каб гасцей частаваць
караваем увосень.

Сяргей ХРАМЯНКОЎ.

*НАМ ПІШУЦЬ*

# Радасць творчай працы

НА ДВАРЭ вясна. Абуджаецца зямля — чакае нашай работы. Усе члены майго ільнаводчага звяна ў нецярпенні. Асабліва хвалююцца лепшыя работніцы Праскоўя Лемеза, Аўгіння Гром, Аляксандра Крупкевіч.

— Як у нас, Праскоўя Іванаўна, з насеннем? — часта пытаюць яны. — Можа не шкодзіць праверыць. Колькі яшчэ тарфянай крошкі трэба вывезці?

Стараюся адказаць як мага паўней, часта і ў іх парады спытаю.

У маім звяне 15 чалавек. Свой участак у шэсць гектараў мы добра падрыхтавалі з восені. Узаралі плугам з перадплужнікам на поўную глыбіню, што садзейнічае накапленню вільгаці і пажывы для раслін. За зіму сабралі пяць тон попелу, каля двух тон птушынага памёту, вывезлі 20 тон тарфянай крошкі. Ачысцілі і рассартавалі насенне — па 150 кілограмаў на гектар.

Летась наша звяно сабрала па 6,2 ц валакна і 6 ц насення з гектара.

Пасевы старанна даглядалі. Пры замаразках ахоўвалі іх дымавой заслонай. Прапалку пачалі адразу-ж, як толькі пустазелле можна было захапіць рукамі. Рыхлілі глебу ў міжраддзях. Тры разы лён падкармлівалі. Бралі яго ў ранній жоўтай спеласці, калі большасць каробачак пачала жоўкнуць, а насенне набыло светлакарычневы колер. Для малацьбы снапы сартавалі па даўжыні і колеру сцябла. Рассцілалі лён у жніўні. Набыўшы вопыт, мы сёлета ўзялі на сябе павышаныя абавязацельствы: сабраць 10 ц ільновалакна і 9 ц ільнонасення з гектара. Вось чаму мы старанна рыхтуемся да сяўбы.

Вечарамі я доўга сяджу над кнігамі. Я сама навучылася чытаць, і ў мяне накапілася цэлая бібліятэчка па пытаннях ільнаводства. Часта ўспамінаю свае гутаркі са знатным ільнаводам Украіны Ефрасінняй Савух. Яна перадала мне свой вопыт.

У пачатку сакавіка ездзіла ў Маскву і атрымала цудоўную новую сеялку.

Жыццё маё напоўнена радасцю творчай працы. Здаецца, сілы растуць з кожным днём. Хіба думала я, што так будзе?

Пра былое ўспамінаю рэдка. Толькі часам, як хмара на небе, мільгне заросшае поле і чорны дым над роднай вёскай. Фашысты паляць нашы Альшаны, а я ў жаху думаю, што няма ў нас больш ні даху над галавой, ні кароўкі... Да мяне туліцца пяцёра дзяцей. Я засталася адна. Мужа мабілізавалі ў Савецкую Армію. У гэты цяжкі час усе мае думкі былі з тымі, хто ўзняўся супроць нашых ворагаў, — з народнымі мсціўцамі. Бацька забраў мяне з дзецьмі ў свой дом, і не было з той пары ні спакойнай ночы, ні спакойнага дня.

— Параска, хавай! — чуўся часам сярод ночы ціхі голас.

Гэта Міхаіл Капліч і іншыя партызаны па заданню прыходзілі ў нашу вёску. Я скрывала іх і пад вечар, схаваўшы ў лодцы пад венцярамі, перавозіла.

— Што, матка, вязеш? — крычаць мне немцы, а я адказваю ўсміхаючыся:

— Еду рыбку лавіць, трэба кіндэр гадаваць... — а ў самой усё дрыжыць: а ну, калі агледзяць лодку.

Цяжкі час скончыўся. Я пачала працаваць у калгасе і бачыла выдатныя вынікі. Людзі цанілі мяне і паважалі. З 1952 года я стала звеннявой па ільну.

Зараз маё звяно — перадавое. Мы збіраем высокія ўраджаі, наш вопыт пераймаюць.

Муж мой загінуў на фронце, але я паставіла на ногі сваіх дзяцей, і яны цяпер дапамагаюць мне. Наперадзе яшчэ шмат працы, шмат клопатаў, але яны мяне не палохаюць. Я шчаслівая, што жыву ў Савецкай краіне.

**П. ШУТ,**

звеннявая калгаса
імя Молатава
Давід-Гарадоцкага раёна.

# Маскоўскаму 20



200 ГОД назад у Маскве адкрыўся першы рускі універсітэт, які носіць імя яго заснавальніка — вялікага сына рускага народа М. В. Ламаносава.

Урачыстае адкрыццё Маскоўскага універсітэта адбылося 26 красавіка (7 мая) 1755 года. Змяшчаўся ён тады на Чырвонай плошчы ў невялікім доме былой аптэкі. Спачатку было ўсяго тры факультэты, 10 прафесараў і толькі 30 студэнтаў. У гэтым першым сваім будынку універсітэт знаходзіўся да канца XVIII стагоддзя, пакуль выдатны рускі архітэктар М. Казакоў не пабудаваў для яго новы будынак на Махавой вуліцы.

За 200 год універсітэт прайшоў вялікі і слаўны шлях.

Дзесяткамі, сотнямі імён сваіх выхаванцаў — выдатных вучоных, пісьменнікаў і грамадскіх дзеячоў — праславіў ён сябе. Тут расцвітаў геній вялікіх вучоных І. М. Сечэнава, Н. Е. Жукоўскага, К. А. Тіміразева, А. П. Паўлава, П. Н. Лебедзева.

Сапраўдны росквіт універсітэта пачаўся ў гады савецкай улады. За перыяд пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ён падрыхтаваў звыш 40 000 спецыялістаў — больш чым за ўсе 163 перадрэвалюцыйныя гады. Зараз на яго 12 факультэтах атрымліваюць вышэйшую адукацыю, уключаючы завочнікаў, больш 21 тысячы студэнтаў, прадстаўнікоў 59 нацыянальнасцей. Сярод іх — шмат сыноў і дачок беларускага народа. Тут вучыцца выхаванка Жыткавіцкага дзіцячага дома, бацькі якой загінулі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, Яніка Хільман; сын калгасніка Брэсцкай вобласці Міхаіл Крачко; сын бабруйскага рабочага Генадзій Вішнякоў; дачка настаўніцы з Баранавіч Эльвіра Варапаева; сын калгаснага агранома з Магілёўскай вобласці Барыс Леўшанка. Сярод студэнтаў МДУ — шматлікія прадстаўнікі краін народнай дэмакратыі.

З любоўю перадае моладзі свае веды двухтысячны калектыў прафесараў і выкладчыкаў універсітэта. Тут працуюць такія буйнейшыя вучоныя краіны, як акадэмік А. Н. Несмеянаў, І. Г. Петроўскі, Д. В. Скабельцын, А. І. Опарын, М. Н. Ціхаміраў, В. В. Владзіміраў.

Савецкі ўрад высока ацаніў заслугі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. У 1940 годзе ўрад узнагародзіў яго ордэнам Леніна і прысвоіў імя М. В. Ламаносава.

Знамянальнай вехай у гісторыю Маскоўскага універсітэта ўвайшоў 1953 год, калі на Ленінскіх гарах вырас белакаменны палац з цэлым комплексам вучэбных будынкаў. Каб уявіць сабе іх грандыёзнасць, даволі сказаць, што толькі ў галоўным корпусе налічваецца амаль 20 000 памяшканняў. Лабараторыі і кабінеты факультэтаў аснашчоны рознастайнай апаратурай і велізарнай колькасцю наглядных дапаможнікаў, якія выпрабляла 500 прадпрыемстваў краіны.

Апрача вучэбных аўдыторый, лабараторый, бібліятэк, клуба, актавай залы, тут каля 6000 жылых пакояў, абсталяваных з улікам усіх бытавых і культурных патрэб студэнтаў і аспірантаў. На кожным паверсе — кухонныя і бытавыя памяшканні, гасціныя, чытальні.

Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М. В. Ламаносава стаў гордасцю савецкай і сусветнай культуры.

## Апраўдаем давер'е

У ЧАСЕ перапынкаў паміж лекцыямі ў калідорах універсітэта можна бачыць шумны паток маладых людзей. Яны размаўляюць на розных мовах, але жывуць аднымі марамі, імкнуцца да адной мэты — атрымаць як мага больш ведаў, стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Усе яны ўмеюць па-сапраўднаму дружыць і кахаць. Мне прыемна ўсведамляць, што і я — дачка рускага шахцёра з падмаскоўнага гарадка Сталінагорск — з'яўляюся членам гэтай вялікай і дружнай сям'і.

Цікавыя лекцыі і работа ў лабараторыях, бурныя і ўсхваляваныя дыспуты, летнія турысцкія паходы і экскурсіі, тэатры, музеі і вясёлыя студэнцкія вечары — усё гэта запаўняе наша жыццё на працягу пяці год навучання. Калі-ж набліжаецца дзень разлукі з універсітэтам, выпускнікоў ахапляе міжвольны сум. Прыяцелі раз'едуцца ў розныя канцы краіны, вернуцца на радзіму і сябры-іншакраінцы. Але яны ведаюць, што кожны з іх дакажа вернасць марам студэнцкай дружбы, адкажа справай на клопаты партыі і ўрада.



Галоўнае кнігасховішча МДУ імя Ламаносава. Тут можна заказаць любую кнігу, якую даставіць на любы паверх ліфт-канвеер.

Л. НОВІКАВА,
студэнтка V курса гістарычнага факультэта МДУ.

У гасцінай інтэрната МДУ.
На здымку: Лілія Новікава, Жамбалын Гунгаа, Влада Федасюк.

# Універсітэту 200 год

## Дзякуй за дружбу

Тысячамі ярка асветленых вокан зззяе вечарамі на Ленінскіх гарах белакаменны Палац навукі — Маскоўскі дзяржаўны універсітэт. Тут жывуць і авалодваюць ведамі тысячы юнакоў і дзяўчат, якія прыехалі з розных куткоў вялікай совецкай краіны і краін народнай дэмакратыі.

І хіба трэба гаварыць, якое вялікае пачуцце ўдзячнасці совецкаму народу адчуваем мы — прадстаўнікі мангольскага народа, студэнты лепшага універсітэта свету.

Мой народ абавязаны вялікаму Совецкаму Саюзу сваім жыццём, сваёй незалежнасцю, сваім эканамічным і культурным развіццём. Сотні вучоных Мангольскай Народнай Рэспублікі выхоўваліся ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце.

Чацвёрты год я вучуся на біёлага-глебавым факультэце, будынак якога знаходзіцца ў аграбатанічным садзе на Ленінскіх гарах. Тут мы бачым раслінны свет ва ўсёй яго living разнастайнасці.

Ва універсітэце я набыла сапраўдных сяброў, якія аказваюць мне неацанімую дапамогу ў вучобе. Вялікая дружба звязвае мяне, у прыватнасці, з дачкой беларускага народа Владзіславай Федасюк, дачкой рускага народа Ліліяй Новікавай.

Маскоўскі дзяржаўны універсітэт — кузня высокакваліфікаваных кадраў не толькі для СССР, але і для краін народнай дэмакратыі.

**Жамбалын ГУНГАА,**
студэнтка 4 курса біёлага-глебавага факультэта МДУ.





Інтэрнацыянальныя сустрэчы студэнтаў на вечары.
На здымку: (злева направа) студэнты ў актавай зале МДУ Саід Муратаў і Ойша Турсунава (Таджыкская ССР), Данута Дземідовіч (Польшча), Еўгеній Караваеў (Масква) і Марыя Ото (Германская Дэмакратычная Рэспубліка).
Фото Я. Халіпа

## Сілы і веды — любімай Радзіме

У дні, калі я заканчваю падрыхтоўку да абароны дыпломнай работы і ззаду засталіся 5 год напружанай і захапляючай вучобы на хімічным факультэце Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава, міжволі на памяць прыходзіць 1950 год. Успамінаюцца радасныя хвіліны, калі я, выпускніца мінскай сярэдняй школы, даведалася, што залічана студэнткай хімічнага факультэта.

— Вучыцеся, авалодвайце ведамі, назапашанымі чалавецтвам. Радзіма нічога не шкадуе для сваіх сыноў і дачок, для прагрэсу перадавой навукі, — сказалі мне старэйшыя таварышы.

Гэты баявы наказ я заўсёды імкнулася з гонарам выконваць. Я дала слова вучыцца толькі на выдатна і сёння магу заявіць, што стрымала яго: вышэйшыя ацэнкі маю па ўсіх дысцыплінах.

Непрыкметна прайшло пяць год, поўных напружанай вучобы і радасці навуковых пазнанняў.

Наш хімічны факультэт размяшчаецца зараз у адным з велічных будынкаў на Ленінскіх гарах. Тут ёсць усё, што можа спатрэбіцца студэнтам і аспірантам для вучэбных заняткаў і навуковых доследаў. Сотні лабараторый аснашчоны навейшым абсталяваннем. Нашымі выкладчыкамі з'яўляюцца буйнейшыя вучоныя: акадэмікі Несмеянаў, Рэбіндэр, Фрумкін, Семёнаў.

Вялікія клопаты праяўлены партыяй і ўрадам аб нашых бытавых умовах. Кожны студэнт мае асобны, добра абсталяваны пакой. Да іх паслуг — вялікі клуб са шматлікімі пакоямі для заняткаў мастацкай самадзейнасцю, спартыўныя памяшканні, плавальны басейн, манеж і г. д. У велічнай актавай зале на паўтары тысячы чалавек выступаюць лепшыя сілы сталічных тэатраў. У прасторных і ўтульных гасцінных пры студэнцкіх інтэрнатах можна добра адпачыць пасля заняткаў.

У двухсотую гадавіну МДУ хочацца ад усёй душы падзякаваць партыі і ўраду за тое, што яны зрабілі для моладзі. Разам з тым я ўрачыста запэўніваю, што на практычнай рабоце не зняслаўлю гонар і славу Маскоўскага універсітэта і як выхаванка яго, як дачка беларускага народа аддам усе сілы і веды любімай Радзіме.

**В. ФЕДАСЮК,**
студэнтка V курса хімічнага факультэта МДУ.



# Пясняр народа

Мінула 50 год з таго часу, як на старонках рускай газеты «Северо-Западный край», што выдавалася ў Мінску, быў апублікаваны верш «Мужык». Аўтар яго, малады, нікому яшчэ не вядомы паэт Іван Дамінікавіч Луцэвіч, выступіўшы пад псеўданімам «Янка Купала», у хуткім часе стаў агульнапрызнаным паэтам беларускага народа.

Дзве аднолькавыя па часу даты адзначаем мы ў бягучым годзе: пяцідзесяцігоддзе першай рускай рэвалюцыі і пяцідзесяцігоддзе літаратурнага дэбюту Янкі Купалы. Дзве гэтыя даты ўзаемна абумоўлены: без рэвалюцыі 1905 года немажліва сабе ўявіць з'яўленне Янкі Купалы; вялікая вызваленчая барацьба народных мас не магла не нарадзіць песняроў рэвалюцыі. Таленты заўсёды з'яўляюцца там, дзе ў іх ёсць неабходнасць.

Выдатныя грамадскія дзеячы нараджаюцца вялікай эпохай. Магутны рэвалюцыйны рух рускага пралетарыята ў пачатку бягучага стагоддзя ўзняў шматлікія народы Расіі да актыўнага грамадскага жыцця.

На рашучую барацьбу супроць самаўладства выступіў і беларускі народ. Да краёў перапоўнілася чаша яго цярпення. Нязноснымі далей сталі прыгнечанне і эксплуатацыя, парушэнне ўсялякіх чалавечых правоў, зневага нацыянальнай годнасці. Патрэба ў мастацкім адлюстраванні жыцця народа, у выказванні яго настрояў, дум, мар і спадзяванняў заўсёды вялікая, але ў пераломныя гістарычныя часы яна робіцца надзвычай неабходнай, і таму з'яўляюцца такія мастакі слова, якія сваёй дзейнасцю складаюць цэлую эпоху ў развіцці грамадскай думкі народа і ў значнай меры падрыхтоўваюць і прадвызначаюць развіццё нацыянальнай літаратуры ў будучым.

У незабыўную эпоху 1905 года беларускі народ адчуў асаблівую патрэбу ў вялікіх мастаках слова, і з яго глыбінь выйшлі Янка Купала і Якуб Колас.

Сіла і адвечная каштоўнасць паэзіі Янкі Купалы заключаецца ў тым, што ў ёй выказаны самыя задушэўныя, самыя глыбокія народныя пачуцці: нянавісць да ўсяго нізкага, пошлага, нікчэмнага і палымяная любоў да прыгожага і велічнага.

Нізкім і пошлым паэт лічыў прыгнечанне і эксплуатацыю нязначнай колькасцю багатых людзей і царскім урадам агромністай большасці народа; у паднявольным і бяспраўным становішчы людзей працы, стваральнікаў усіх каштоўнасцей на зямлі, ён бачыў найвялікшую несправядлівасць тагачаснага грамадска-палітычнага ладу і таму лічыў, што існаванне яго не мае ніякага апраўдання. Пафас дакастрычніцкай творчасці Янкі Купалы заключаўся ў рашучым адмаўленні буржуазна-памешчыцкага грамадства, у закліках да рэвалюцыйнага знішчэння самаўладства.

У аўтабіяграфічных нататках Янка Купала ўказваў, што, збіраючыся пісаць вершы, ён добра ведаў, аб чым трэба пісаць. Уся творчасць паэта з'яўляецца пераканаўчым пацверджаннем справядлівасці гэтых слоў. Яшчэ ў юнацтве паэт пазнаў усю горыч становішча беднага чалавека. Асабістае жыццё песняра, прыватныя нягоды далі яму мажлівасць глыбей і паўней зразумець сутнасць жыцця ўсяго народа, пазнаць яго крыўды, асэнсаваць і ўсвядоміць яго імкненні і жаданні. Вось чаму дакастрычніцкая паэзія Купалы з'яўляецца выяўленнем яго рэвалюцыйна - асветніцкіх ідэалаў. Паказваючы жахлівасць нявольніцтва, паэт абуджаў імкненне да волі:

Няхай свет пазнае ўсе песні бяздольніка,  
Хай вораг-мучыцель дрыжыць з праўды слоў,  
Быць вольным хай родзяцца думкі ў нявольніка,  
Хай быць чалавекам захоча брат мой.  
(«Вы кажаце», 1906 г.).

Прыгожае і ўзвышанае ў эстэтыцы Купалы, ідэал, да якога трэба імкнуцца, за які неабходна змагацца, не шкадуючы сваіх сіл, — гэта свабоднае і шчаслівае жыццё народа ў самым шырокім значэнні слова.

Дарэвалюцыйная паэзія Купалы прасякнута нянавісцю да тых, «хто на люд братні кайданы ўздзявае», і страснымі заклікамі ісці наперад, да свету прывольнага, здабываць свабоду, усходы новыя сеяць на зямлі, змагацца за славу свайго народа, за веліч радзімы. Адсюль — услаўленне высокай годнасці і сілы чалавека, паэтызацыя працы. Абранне працоўнага чалавека станоўчым героем сваёй творчасці сцвярджае, што народ з'яўляецца асноўнай і рашаючай сілай грамадства.

У змрочныя часы царызма Купала накіроўваў усе намаганні на тое, каб у сэрцах чытачоў «распаліць агні веры ў будучнасць», запэўніць іх, што дзён лепшых яны дачакаюцца.

Любімыя героі Купалы — чэсныя, непадкупныя праўдашукальнікі. У адстойванні праўды яны праяўляюць выключную мужнасць і згодны лепш прыняць смерць, чым зганьбіць сваё імя, зняважыць свой гонар. Старац з паэмы «Курган» не пажадаў запляміць душу і сумленне дукатамі князя; ён згадзіўся памерці лютай смерцю, выказаўшы абураючыя словы праўды прыгнятальніку. Бандароўна — гераіня аднайменнай паэмы — таксама пайшла на смерць, не пажадаўшы быць наложніцай пана-мучыцеля.

Разуменнем прыгожага абумоўлены і эстэтычны ідэал паэта. Купала лічыць, што спеў песняра павінен быць песняй народнай, што словамі паэта павінен гаварыць сам народ. Жыць адным жыццём з народам — у гэтым сэнс жыцця сапраўднага песняра, яго найвялікшае асабістае і грамадскае шчасце:

З цэлым народам гутарку весці,  
Сэрца мільёнаў падслухаць біцця —  
Гэткай шукаю цэлы век чэсці,  
Гэта адно мне падпорай жыцця...

...За лепшу долю роднага краю,  
За сваіх брацціяў ў святой барацьбе —  
Гэтакай толькі смерці жадаю,  
Памяткі гэткай чакаю сабе.  
(«З кутка жаданняў», 1912 г.).

## Для тых, якіх люблю

**Янка КУПАЛА**

Палюбіў я Марусю ўсім сэрцам,
А Марысю йшчэ болей, здаецца.
А папраўдзе люблю абодвух
Адналькава, ціхенька і ўслух.

Аб іх долі выдумываў песні
Йшчэ тады — прад вялікім прадвеснем,
І сягоння наяве і ў сне
Яны ўсюды са мною, пры мне.

Ці пабачу я комін фабрычны,
Ці пабачу палетак пшанічны,
Лятуць думкі, заводзяць гульню
Ды ўсё з тымі, якіх я люблю.

Залатымі пяскамі пад ножкі
Пасыпаў-бы ім сцежкі-дарожкі,
Падсцілаў-бы ім сонца святло,
Каб да вечнага шчасця вяло.

Так люблю ад усходу да ўсходу
Чарнавоку Марусю з завода.
З лілій-кветак ёй віў-бы вянок,
Прыбіраў-бы ў атласы і шоўк.

Так люблю за дзявочыя красы
Сінявоку Марысю з калгаса,
З лілій-кветак ёй віў-бы вянок,
Прыбіраў-бы ў атласы і шоўк.



Шчырая дружба еднала двух вялікіх пісьменнікаў — Максіма Горкага і Янку Купалу. На здымку: у музеі Янкі Купалы.

Паэт з гонарам адзначаў, што ён пісаў не за чырвонцы багатых людзей, і будучыня не знойдзе на яго творчасці ганебных плям прадажнасці.

Глыбокі гуманізм, рэвалюцыйная накіраванасць і шчыры інтэрнацыяналізм вызначаюць асноўныя рысы творчасці Янкі Купалы першага этапа.

У савецкай рэчаіснасці народны паэт бачыў здзяйсненне свайго ідэалу прыгожага і ўзвышанага. У сувязі з гэтым адбыліся вялікія якасныя змены ў яго творчасці. Калі раней паэт складаў гімны свабодзе і шчасцю народа як магчымаму будучаму, да чаго патрэбна імкнуцца ўсёй душой, то пасля рэвалюцыі ён усслаўляе волю і свабоду людзей працы як ужо існуючае, здабытае ў жорсткіх баях. Купала звяртаўся да савецкай моладзі з гарачым заклікам ведаць і шанаваць здабытую свабоду, замацоўваць яе дружнай працай, быць гатовай абараняць яе ў часы грознай непагоды.

Нястомна змагаючыся за роўнасць беларускага народа сярод іншых народаў, Купала са здавальненнем услаўляў сваю свабодную радзіму — Савецкую Беларусь. Вялікай чалавечай радасцю прасякнуты тыя радкі паэмы «Безназоўнае», у якіх паэт гаворыць, што яго пакаленне пакідае сваім патомкам не такую спадчыну, якую яно атрымала ад сваіх продкаў:

Пакінем спадчыну мы для патомкаў
Інакшую ад той,
Што ўзялі мы ад продкаў на абломках
Гісторыі сваёй...
...Яшчэ пакінулі нам асляпленне,
Пашану да пакут,
А мы пакінем песні вызвалення
І вольны бацькаў кут.

(«Безназоўнае», 1924 г.).

Творчасць Я. Купалы савецкага часу — гэта сонечнасветлыя, прамяністыя песні ў гонар чалавека-пераможцы, захапляючая паэзія аб стваральнай калектыўнай працы, урачыстыя гімны яшчэ больш прыгожай і светлай будучыні чалавецтва, эпічна-велічныя сказы аб магутнасці савецкага народа і мудрасці яго лепшых сыноў, згуртаваных у маналітную, непахісную партыю камуністаў.

**Юл. ПШЫРКОЎ.**



У Баранавіцкім паравозным дэпо з вялікай цеплынёй адзываюцца аб рабоце абціршчыцы Анастасіі Вільчэўскай. За добрасумленную працу яна нядаўна ўзнагароджана нагрудным знакам «Выдатны паравознік».

Фото П. Нікіціна

# ПАРАСТКІ КУЛЬТУРЫ



Калгасны паштальён інвалід Айчыннай вайны Нікалай Сцяпанавіч Таран прынёс пошту калгасніцы Мар'і Камароўскай.
Фото П. Нікіціна.

ЗА ЗУБЧАСТАЙ сцяной сасновага бору павольна гасне дзень. Над шырокімі калгаснымі палямі спускаецца вячэрні змрок. За аколіцай сяла Дабрынёва гурчыць трактар. Яго шум усё ўзмацняецца, перарастае ў рокат: у вокнах дрыжаць шыбы. На прычэпе трактара — велізарныя сані. У іх, стоячы, размясціліся дзяўчаты і хлопцы. Гэта моладзь вяртаецца з поля: сёння яшчэ некалькі дзесяткаў тон торфу вывезлі пад яравыя.

Параўняўшыся з клубам, моладзь высаджваецца. Чуюцца галасы:

— Які кінофільм прывезлі?

Аказваецца, сёння ў клубе канцэрт мастацкай самадзейнасці.

— Ой, дзяўчаты, паспець-бы пераапрануцца! — непакоіцца Дзіна Пекарэвіч.

— Паспееш... Яшчэ толькі машыну паслалі за артыстамі.

У клубе гараць яркія агні. З вокан льюцца снапы святла. Увечары сяло шматлюднае, вясёлае. Закончыўшы працоўны дзень, калгаснікі спяшаюць у свой клуб.

... Калі Валя Карачун адчыніла дзверы ў залу, ёй раптам здалося, што ўсе аглядаюць яе. Яна засаромелася і хацела прайсці далей у куток, але дзяўчаты злавілі яе за рукі і ўціснулі паміж сабой. Сядзець было нязручна, цесна. Але што зробіш, спазнілася.

Народу ў клубе — яблыку няма дзе ўпасці. Нават і старыя папрыходзілі.

І вось узнялася заслона. На ўпрыгожанай чырвонымі палотнішчамі сцэне стаялі дзяўчаты ў белых кофтачках і чорных спадніцах з рознакаляровымі істужкамі ў валасах. Ззаду выглядвалі галовы хлапцоў. Валя адразу пазнала ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці з суседняга сяла Станькава.

— Першым нумарам нашай праграмы, — аб'явіў кіраўнік хору І. Яш, — «Песня аб партыі».

... Хор выконвае «Песню барацьбітоў за мір», «Уральскую рабінушку», рускую народную песню «Рабіну».

На сцэне — маладыя калгасніцы ў яркіх нацыянальных касцюмах. Жыва, з задорам танцуюць яны «Бульбу». Гэта адзін з самых удалых танцавальных нумароў. Спадабаліся гледачам і «Чэшская полька» і «Украінскі гапак».

Позна канчаецца канцэрт, але моладзь не разыходзіцца. Не хочацца ад'язджаць і суседзям. У Станькаве пакуль няма добрага клуба, і госці застаюцца патанцаваць ва ўтульнай і прасторнай зале. З'яўляецца гарманіст. Дзяўчаты і хлопцы выходзяць на круг. Вось мільганула ў квяцістай сукенцы знатная свінарка Валя Карачун. Хлопец з суседняга калгаса беражліва вядзе яе па кругу. Гучыць музыка. Вакол радасныя, вясёлыя твары...

Такія вечары бываюць не рэдка. Гэта сяброўскія сустрэчы моладзі суседніх калгасаў.

... Ужо далёка за поўнач, а моладзь усё танцуе. Заўтра нядзеля — можна будзе паспаць.

— Вы толькі зірніце, хлопцы, як тут прыгожа! — гаворыць Аляксандр Няхай са Станькава.

Хлопцы з зайздрасцю аглядаюць прасторны і ўтульны дабрынёўскі клуб. Ёсць чаму пазайздросціць! Дабрынёўцы нядаўна капітальна адрамантавалі свой клуб, і цяпер сапраўды прыемна сюды ўвайсці.

— Вось-бы нам такі клуб! — працягвае Няхай.

— Бярыце прыклад, будуйце, — заўважае загадчык клуба Карачун.

Дабрынёўская моладзь, і не



Загадчыца ўрачэбнага ўчастка Зінаіда Піражнікава выступае перад калгаснікамі на радыёвузле калгаснага клуба.
Фото П. Нікіціна



Дэпутат сельскага Совета аграном калгаса імя Калініна комсамолка Валянціна Сергіенка расказвае калгасніцам аб доглядзе за пасевамі кукурузы.
Фото П. Нікіціна

толькі моладзь — старыя не могуць вечарамі ўсядзець дома. Ледзь сцямнее, як у клубе загараюцца агеньчыкі і вабяць да сябе калгаснікаў. У клубе рэгулярна дэманструюцца кінофільмы. Тут працуе калектыў мастацкай самадзейнасці. Ёсць у ім аматары сцэны, здольныя спевакі, музыканты, дэкламатары. Нядаўна драмгурток паставіў п'есу «Хто смяецца апошні». Кіруе гуртком бібліятэкар Фаіна Радкевіч. Удала выступілі ў гэтай п'есе калгаснікі Хваліноскі, Дубовік і іншыя.

Любоўю і павагай калгаснікаў карыстаецца клубны хор і танцавальны калектыў, арганізатарамі і ўдзельнікамі якіх з'яўляюцца дзяўчаты Ф. Радкевіч, В. Карачун, Д. Пекарэвіч, Л. Карачун.

Расце культура калгаснага сяла. Цікавыя факты прывёў загадчык калгаснай пошты Іван Бярыла. Іван Фядосавіч — мясцовы жыхар. Паштовымі справамі ў Дабрынёве пачаў займацца дваццаць пяць год назад. Тады, у першыя дні калектывізацыі, гаворыць ён, жыхары сяла атрымлівалі ўсяго толькі дваццаць шэсць экземпляраў газет. І гэта — на трыста двароў! Часопісаў дабрынёўцы зусім не выпісвалі. Цяпер у Дабрынёва прыходзіць шэсцьдзесят часопісаў і да чатырохсот газет.

Іван Фядосавіч закрывае сшытак і бярэцца за настройку прыёмніка. Акрамя паштовых спраў, ён кіруе радыёвузлом, адказвае за яго бесперабойную работу. У сяле зараз сто дзевяноста радыёкропак.

... Спускаецца цёплы вясенні вечар, з рэпрадуктара льецца хвалюючая музыка.

**Аляксандр ЛАЗНЯВЫ.**
Калгас імя Калініна,
Дзяржынскі раён.

# Будні дэпутата

У АДНОЙ з устаноў г. Станіслава зазваніў тэлефон — ні грозна, ні мякка, як звычайна. І, як звычайна, трубку ўзяў кіраўнік гэтай установы Сяргей Сцяпанавіч Хамякоў.

— З вамі гаворыць дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Ячмянёва, з Оршы, — павольна гучэў у трубцы ўпэўнены жаночы голас. — Скажыце, калі-небудзь цікавіліся вы лёсам сваёй даваеннай сям'і, жонкай і дзецьмі?

— Н-не ведаю... — разгублена працягнуў Хамякоў.

— Тады я магу вас абрадаваць, — працягваў голас з далёкай Оршы, і Сяргей Сцяпанавіч улавіў суровы папрок. — Яны жывыя і здаровыя. І зараз будуць з вамі размаўляць. Перадаю трубку Надзеі Іванаўне.

Хамякоў зусім разгубіўся. Хоць апошні раз бачыўся з жонкай чатырнаццаць год назад, але адразу пазнаў яе голас. У сэрцы заварушыліся даўно забытыя пачуцці, у галаве паднялася мітусня думак. І грозным абвінавачаннем узнікла пытанне: а што стане з новай сям'ёй, як перанясе яна гэты ўдар? Ён-жа ніколі не гаварыў сваёй цяперашняй жонцы аб той, аб ранейшай. І потым дзеці — і там і тут. Думкі блыталіся, знікалі. І хоць усхваляваны голас Надзеі Іванаўны гучэў выразна, Хамякоў рабіў выгляд, што не чуе. Ён увесь час крычаў «ало», дзьмуў у трубку, нарэшце, кінуў яе на рычаг і закрыў твар рукамі. Што ён мог сказаць у сваё апраўданне? Заблытаўся, злоўлены на месцы злачынства. У дзверы настойліва стукалі, але Сяргей Сцяпанавіч нічога не чуў.

А ў гэты час у Оршы, на кватэры Ячмянёвай, у глыбокім маўчанні сядзела сама гаспадыня, Надзея Іванаўна Хамякова і яе старэйшы сын, Гэнадзій, студэнт Віцебскага мастацкага вучылішча. Ніна Іванаўна ў задуменні глядзела на іх, а Надзея Іванаўна ўсё яшчэ трымала ў апушчанай на калена руцэ раптам змоўкшую трубку. На твары было здзіўленне і пакута. Міжвольна паўсталі перад ёю бесклапотныя маладыя гады...

— Якая подласць, — прамовіла яна, сухім гарачым позіркам пільна ўглядаючыся ў адну кропку, ні-

бы спадзеючыся прачытаць на сцяне адказ на дакучлівае пытанне.

— Мама,—спыніў яе думкі Генадзій,—мы абавязкова з'ездзім да яго. Праўда? Я хачу ўбачыць свайго бацьку.

— Добра, сынок, з'ездзім,—ачнуўшыся ад цяжкіх дум, сказала Хамякова.—Дзякуй табе, Ніначка, за дапамогу, за ўдзел.

Праводзіўшы іх да дзвярэй, Ніна Іванаўна вярнулася ў пакой. Яна падышла да акна, расхінула рукамі фіранкі. На вуліцы хутка цямнела. У вокнах дамоў адзін за другім успыхвалі агні. Ніна глыбока ўздыхнула і адышла ад акна. Не запальваючы святла,



Ніна Ячмянёва (злева) правярае якасць гатовай прадукцыі ў перадавіка вытворчасці — камсамолкі Нэлі Харошча, якая выконвае нормы на 180—200 прац.

Фото І. Стэца

прылягла на ложак. Сёння ёй нездаровілася. Адпачыць-бы, але хіба заснеш пасля такой цяжкай сцэны.

Мяккі поўзмрок у пакоі скрадвае сцены, абрысы рэчаў. Здаецца, што вакол—бязмежная прастора. У такой абстаноўцы добра падумаць, памарыць. І праходзіць перад Нінай усё яе нядоўгае жыццё...

Дзяцінства правяла ў вёсцы. На ільнокамбінат паступіла ў 1949 годзе.

Здавалася-б, зусім няхітрая справа сшываць мяшкі: страчы сабе шоў ды і толькі. Але ў тым якраз і загвоздка, што радок павінен быць раўнюткі, што трэба ўважліва сачыць, каб на выраб не капнула хоць-бы кропля машыннага масла, інакш атрымлівай рэпутацыю бракароба. Не ўжо, няхай сабе будзе, што хочаце, толькі не гэта! І Ніна напружвала ўсю ўвагу, каб не дапусціць ні малейшай памылкі.

Усё ішло сваёй чаргой, і раптам, як снег на галаву, звалілася хвалюючая вестка—калектыў ільнокамбіната вылучыў яе кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Саюза ССР. Ніна разгубілася. «За што такі вялікі гонар?»—пытала яна ў самой сябе і не знаходзіла адказу.

Потым—Масква, удзел у рабоце першай сесіі Вярхоўнага Совета Саюза ССР, новыя цікавыя сустрэчы, яркія ўражанні.

У Оршу Ніна Іванаўна вярнулася ўнутрана падцягнутай, пасталеўшай, гатовай да вялікай і адказнай работы.

З новымі сіламі ўзялася Ячмянёва за справу. З кожным днём працавала ўсё лепш. Хутка яе вылучылі інструктарам па перадачы перадавых метадаў.

За тры месяцы Ніна навучыла 72 дзяўчыны.

Вечарамі, прыходзячы дамоў, Ніна знаходзіла ў сябе на стале пачку пісем. Яна запальвала электрычнасць і пачынала іх уважліва разбіраць. У асноўным гэта былі скаргі выбаршчыкаў свайму дэпутату на паасобныя няправільныя дзеянні мясцовых улад. Але сустракаліся і даверлівыя просьбы дапамагчы разабрацца ў цяжкіх бытавых і асабістых пытаннях.

З такой просьбай звярнулася да Ячмянёвай і Надзея Іванаўна Хамякова. Як і звычайна, Ніна прыняла самы гарачы ўдзел у яе справе. Яна не супакоілася да таго часу, пакуль не навяла даведкі аб мужу Хамяковай, якога тая лічыла загінуўшым у часе вайны. І вось цяпер усё стала ясна—Хамякоў кінуў сям'ю і абзавёўся другой. Для жанчыны няма больш цяжкага ўдару, чым пераканацца ў подласці чалавека, якога кахала і паважала. Але дапамагчы ёй разабрацца ў гэтым было неабходна: самая суровая праўда лепш самай прыгожай хлусні. Цяпер, прынамсі, бацьку прымусяць дапамагаць дзецям.

Ніна ўспомніла раптам твар Надзеі Іванаўны, які пацямнеў ад гора і неяк адразу асунуўся, сумны, поўны цяжкай горычы погляд Генадзія, звернуты на незразумела змоўкшую тэлефонную трубку, і сэрца заныла ад жалю. Не, гэта быў, бадай, не жаль, а абурэнне чалавекам нізасцю, з якой яна, як слуга народа, павінна бязлітасна змагацца.

У вокнах насупраць адзін за адным гаслі агні. У пакоі стала зусім цёмна. Ніна распранулася і лягла ў пасцель. Але сон яшчэ доўга не ішоў да яе.

...Назаўтра ў цэху да Ніны падышла Хамякова, твар якой захоўваў сляды бяссоннай ночы.

— Валерык і Геня хочуць убачыць бацьку,—сказала яна.—Збіраемся ехаць. Толькі баюся, што грошай на дарогу не хопіць. Як-ні-як, а дарога не блізкая.

— Пачакайце мяне тут, Надзея Іванаўна,—адказала Ячмянёва,—зараз вярнуся. Яна паднялася да дырэктара камбіната і дамовілася, каб Хамяковай аказалі дапамогу.

Зараз Надзея Іванаўна атрымлівае ад былога мужа сродкі на выхаванне дзяцей. Здавалася-б, дэпутат выканаў свой абавязак і можа быць спакойны. Але Ячмянёва не ўпускае з поля зроку сям'ю Хамяковай. У часе зімовых канікул дапамагла ўладзіць Валерыка ў піонерскі лагер. Калі Надзею Іванаўну паклалі ў абласную бальніцу, сама паехала ў Віцебск, каб праведаць хворую.

З вялікай чалавечай цеплынёй адносіцца Ячмянёва да кожнай скаргі, да кожнай просьбы сваіх выбаршчыкаў. Калгасніцу Анастасію Цімафееўну Карота ў час адпачынку сама адвезла ў Мінск на кансультацыю да прафесара; Пелагею Антонаўну Цішкевіч дапамагла ўладзіць у Рацоўскі дом інвалідаў, а сына яе—у дзіцячы дом, хадайнічае аб выдзяленні аўтамашыны для Берасцяноўскага дзіцячага дома Дубровенскага раёна... Ды хіба апішаш усе справы, якімі даводзіцца займацца дэпутату Ячмянёвай!

Нястомна працуе і вучыцца Ніна Іванаўна Ячмянёва—простая савецкая дзяўчына, слуга народа, актыўны барацьбіт за мір і шчасце на зямлі.

**Н. ПЯТНІЦКІ**



# Люстэрка

**Хв. ЖЫЧКА**

Мал. Ф. Бараноўскага

ЗІНА зусім не была падобна на свайго бацьку. У машыне яна адчувала сябе неяк нясмела, не па-гаспадарску. Сядзе на задняе сядзенне і абавязкова падніме шкло: не хоча, каб хто пазнаў яе. З гэтае прычыны і папрасіла шафёра Сцяпана не падвозіць да самага інстытута, а спыняцца ля Заходняга маста.

«А што ў гэтым дрэннага? — дзівіцца Сцяпан. — Усім-жа вядома, што жыве Зіна далёка, на ўскраіне. А бацькава машына ўсёроўна без справы каля міністэрства стаіць. Чаму-ж не пад'ехаць?..»

— Чаму-ж не пад'ехаць? — гэтае пытанне ўзнікае ў галаве кожны раз, калі ён вязе Зіну. Шукае Сцяпан адказу, а сам міжвольна раз-по-раз заглядае ў люстэрка, якое, і сам не ведае чаму, заўсёды прыкметна паварочвае так, каб бачыць задуменны зінін тварык. «Аб чым яна думае?» — гэта другое пытанне, на якое хоча знайсці адказ Сцяпан.

Сустрэчныя машыны, скрыжаванні вуліц, агні светафораў перашкаджаюць сканцэнтраваць усю ўвагу на гэтых пытаннях. Везучы дзяўчыну, Сцяпан адчувае нейкую павышаную адказнасць. Асабліва, калі даводзіцца прытармажваць. Ад вялікага напружання аж пот выступае на ілбе. І самай высокай узнагародай з'яўляецца спакойны задуменны тварык у рамцы люстэрка: пасажырка і не заўважыла, што сталі.

У канцы дарогі, на Маскоўскай вуліцы, сустрэчных машын няма. Сцяпан уводзіць сваю «Пабеду» ў агульны паток гарадскога транспарту і зноў вяртаецца да сваіх пытанняў: «Чаму-ж не пад'ехаць на бацькавай машыне?», «Аб чым думае Зіна?»

Ён разумее, што пытанні гэтыя бязглуздыя, і адказаць на іх немагчыма. Але чамусьці прыемна думаць, і ён думае. Думае і ўсё часцей пaглядае ў люстэрка.

За мастом амаль механічна збочвае і каля сквера плаўна спыняе машыну.

— Дзякую!

Рэзкі стук дзвёркі, бы нажом хтосьці разануў па сэрцы, і адразу ў машыне становіцца пуста, цёмна. А на душы так маркотна!..

«І чаму так блізка інстытут!» — шэпчуць вусны.

Са злосцю крута паварочвае баранку і ўключае першую хуткасць. Спяшаць няма куды: наперадзе — самотны доўгі дзень, «дзяжурства» ля міністэрства, адзін-двакілометравыя рэйсы да Дома ўрада. Ці-ж гэта работа! Навошта толькі даюць машыны работнікам міністэрстваў?..

І, як нешта дарагое, успамінае Сцяпан сваю працу ў рэдакцыі. Там вольнай хвіліны не было. Не паспееш аднаго супрацоўніка высадзіць, як чуеш:

— Сцёпа, падкінь!

А загадчык сельскагаспадарчага аддзела Валодзя Кліцуноў ледзь не ператварыў яго ў асабістага фурмана.

— Запрагай, Сцёпа, — жартаваў ён. — Едзем у калгас.

І якая асалода была вазіць гэтых простых хлопцаў. Колькі навін, забаўных гісторый пачуеш ад іх за дарогу! Хіба можна параўнаць з імі Цімафея Антонавіча, які амаль і не размаўляе са Сцяпанам.

«Дурань быў, пагнаўся за большай зарплатай», — пачынае шкадаваць Сцяпан. І ўжо рашае зноў перайсці на старое месца, але ўспамінае Зіну, і думкі яго бяруць другі кірунак. А хто яе будзе падвозіць? Трапіць які-небудзь шалапут і, чаго добрага, яшчэ падаб'е... Не, нікуды ён пераходзіць не будзе, пакуль не скончыць Зіна інстытут.

У гэты дзень Цімафей Антонавіч быў непазнавальны. Вясёлы і бадзёры, ён ускочыў на любімае месца побач з шафёрам, гучна загадаў: «На абед!» і ўсю дарогу насвістваў матыў «Сормаўскай лірычнай». «Нешта здарылася... падбадзёрвае сам сябе», — заключыў Сцяпан.

А вечарам Цімафей Антонавіч, ужо зусім невясёлым голасам, паведаміў:

— Усё. Апошні раз падкінь мяне, Сцяпан, дадому.

— Чаму — апошні?

— Я звольнены... — і, нібы ў апраўданне, дадаў: — Па скарачэнню штатаў.

— Каго-ж буду вазіць? — запытаў шафёр.

— Не ведаю. Прыедзеш заўтра к дзесяці, скажуць.

* * *

Сцяпан строга вытрымліваў распарадак дня. У адрозненне ад большасці халасцякоў, ён не любіў песціцца ў ложку. Прачнецца — і адразу на ногі. А прачынаўся ён з першым

**А. ВЯРЦІНСКІ**

## Я іду зялёным лугам

Я іду зялёным лугам,
Сцелецца трава.
І чамусьці кругам, кругам
Ходзіць галава.

Ці таму, што я ў брыгадзе
Лепшая жняя.
Ці таму, што ўчора ў садзе
З ім сядзела я.

Гуляў вецер русым чубам,
Казаў хлопец мне,
Што я стала яму любай
Яшчэ па вясне.

І што я яго надзея,
Сонейка яго.
Жыць не можа без мяне ён
Дня ні аднаго.

Я-ж стрымала ў сакрэце, —
Не сказала, не!
Што і ён за ўсё на свеце
Даражэйшы мне...

Я іду зялёным лугам,
Сцелецца трава.
І ад шчасця кругам, кругам
Ходзіць галава.

сігналам маскоўскай радыёстанцыі. Роўна гадзіна ішла на зарадку, туалет і прыгатаванне снедання.

А сёмай Сцяпан спяшаў у гараж. У пэўны час заўсёды вяртаўся з працы, у пэўны час хадзіў у магазін, вячэраў, клаўся спаць. Цётка Соня, гаспадыня, жартавала, што свой гадзіннік яна правярае не па радыё, а па кватаранту.

Здавалася, не знойдзецца ў свеце сілы, якая прымусіла-б хлопца парушыць яго распарадак. Але такой сілай аказаўся самы нязначны ў сцяпанавым жыцці факт — звальненне начальніка, якога ён не паважаў і нават крыху недалюбліваў.

Сцяпан доўга не мог заснуць. Нейкая незразумелая туга ахапіла яго. Асэнсаваць гэтую тугу, знайсці яе вытокі не ўдавалася. «Ну, зволілі Цімафея Антонавіча, паставяць другога. Хіба не ўсёроўна, каго вазіць: Цімафея Антонавіча, ці Антона Цімафеевіча?» Каб абгрунтаваць сваю думку, Сцяпан



стаў «перабіраць па костачках» свайго начальніка, знаходзіць усе яго адмоўныя якасці, прыпамінаць выпадкі, калі гэтыя дрэнныя якасці ярчэй праяўляліся. І здзівіўся: аказваецца, такія факты не засталіся ў памяці. Міжвольна з'явіўся вывад, што Цімафей Антонавіч нічым не горшы другіх начальнікаў, якіх даводзілася яму вазіць. «Задаецца, глядзіць на людзей зверху?.. Ды ці мала хто задаецца! А як ён павінен глядзець на шафёра?.. Дай нашаму брату волю, — разбэсціцца, гультаём стане...» І Сцяпан адчуў сябе за рулём. А побач — Цімафей Антонавіч, надзьмуты, строгі. Пераводзіць позірк на люстэрка. У ім бачыць задуменны тварык Зіны. «Аб чым яна думае?» — паўстае пытанне. Спакойным голасам Цімафей Антонавіч адказвае: «Яна думае, чаму нельга ездзіць на бацькавай машыне».

Сцяпан уздрыгвае і прачынаецца.

«Д'ябальшчына нейкая», — шэпча хлопец і глядзіць на гадзіннік: палова сёмай.

Хуценька апрануўся і не снедаўшы выскачыў з хаты. Цётка Соня здзіўлена глядзела ўслед: упершыню за тры гады кватарант парушыў свой распарадак.

На вуліцы гуляла завіруха. Па заледзянелым асфальце вецер гнаў сівыя пасмы снегу. «На Цагляным, напэўна, усе вуліцы замяло», — мільганула думка. І Сцяпан прыспешыў крок.

Загадчык гаража не вельмі цікавіўся, каго возяць шафёры, як і калі мяняюцца іх начальнікі. Належыць машына ўстанове, значыць, нехта-ж павінен ездзіць. Інакш і пуцёвак не падпісвалі-б. А пуцёўка — дакумент і прытым асноўны. Сцяпана ён паважаў за акуратнасць і сумленныя адносіны да машыны. Вось і сёння Сцяпан — малайчына! Ведае, што мароз моцны, прыйшоў першым, каб разагрэць матор і ў час з'явіцца на працу. Такога хлопца варта і пачаставаць ленінградскім «Беламорам».

Атрымаўшы ад «заўгара» самую высокую яго ўзнагароду — ленінградскай фабрыкі папяросу, якія невядома дзе той даставаў, Сцяпан вывеў сваю «Пабеду» на вуліцу. Праскочыўшы Заходні мост, ён узяў кірунак на Цагляны пасёлак...

Зіну пазнаў здалёк. Замецёнай сцяжынкай ішла яна да аўтобуснага прыпынку. Сцяпан аб'ехаў заводскі клуб і ззаду дагнаў яе.

— Зінаіда Цімафееўна, сядайце, падкіну... якраз... — адкрыў шафёр дзверку.

Дзяўчына здзіўлена паглядзела на Сцяпана, затым на гадзіннік, зноў на Сцяпана і нарэшце села на сваё месца.

І зноў на душы стала радасна і весела. Плаўна вядзе Сцяпан машыну па няроўных вуліцах і сам раз-по-раз заглядае ў люстэрка, у якім зноў бачыць задуменны зінін тварык.

«Аб чым яна думае?..»

На Маскоўскай вуліцы ўводзіць машыну ў паток гарадскога транспарту. Цяпер можна часцей глядзець у люстэрка. Зіна ў той-жа позе, такая задуменная.

Раптам позіркі іх сустрэліся. Нібы электрычны ток прабег па ўсім целе, і Сцяпан выпусціў руль. Машына ўскочыла на трамвайную лінію. Хутка авалодаў сабой, націснуў тармазную педаль. Уздрыгануўшы, машына спакойна выпаўзла на асфальт. Вядома, Зіна адчула штуршок, і гэтага не мог дараваць сабе Сцяпан.

Вось і Заходні мост. Сцяпан збочвае і каля сквера плаўна спыняе машыну. Але Зіна не спяшае выходзіць.

— Вось што, Сцёпа, — ціха гаворыць яна. — Каб больш такіх «выпадковых» сустрэч не было, чуеш!

Сцяпан маўчыць. Яму прыемна слухаць яе голас.

— ...Ты не маеш права... Машына не ўласная... І я не сяду больш... Гэта сёння... сёння я спазнілася-б і маглі падумаць... Маглі-б дрэннае падумаць...

Сцяпан бачыць у люстэрку, як ледзь-ледзь варушацца яе вусны, узнікаюць і растаюць ямачкі на шчоках. І нечакана для самога сябе ён гаворыць у люстэрка:

— Я не магу не прыязджаць за табой...

— Ты не маеш права... — адказвае люстэрка.

— Я павінен цябе бачыць... кожны дзень...

Люстэрка маўчыць.

— Кожны дзень... — шэптам паўтарае Сцяпан і паварочваецца. Яго сустракае адкрыты позірк дзяўчыны.

— Можна ў іншым месцы, Сцёпа, — усміхаецца Зіна і працягвае яму паперку.

Знаёмы рэзкі стук дзверкі вяртае шафёра на зямлю. Ён здзіўлена глядзіць на знаёмую постаць, якая хутка аддаляецца і раствараецца ў натоўпе. Затым пераводзіць позірк на паперку, чытае:

— «Запрашальны білет на студэнцкі вечар...»

Вечарам кватарант здзівіў цётку Соню новымі парушэннямі распарадку дня. Час, які звычайна адводзіўся на паход у магазін, ён авансаваў для прасавання гарнітура. Замест прыгатавання вячэры, сеў галіцца.

Праз некалькі хвілін ён выйшаў з пакойчыка, апрануты па-святочнаму. Моўчкі прыкрыў дзверы і выйшаў. Цётка Соня з цікавасцю выскачыла на ганак.

Са стрэх буйнымі кроплямі ападаў растаўшы снег. Заходзячае сонца ляжала на даляглядзе, нібы яму шкада было пакідаць зямлю, якая імкліва ляцела ў абдымкі вясны.

— Эге-ж! — многазначна ўсміхнулася ўслед Сцяпану цётка Соня.

# Адказны час

КАНЧАЕЦЦА апошняя чвэрць навучальнага года, набліжаюцца экзамены. Каб добра падрыхтавацца да іх, трэба правільна арганізаваць работу вучняў у школе і дома.

У школе зараз побач з праходжаннем новага праграмнага матэрыялу арганізавана паўтарэнне пройдзенага. Не трэба паўтараць усё падрад, бо траціцца шмат часу. Кожны настаўнік павінен ведаць, што яго вучні засвоілі лепш, а што слабей, і паўтараць цяжэйшае, асноўныя, галоўныя тэмы.

У кожнай школе арганізуюцца пакоі для падрыхтоўкі да экзаменаў. Тут вучні знойдуць наглядныя дапаможнікі па рускай і беларускай мовах, матэматыцы, хіміі, фізіцы, прыродазнаўству, геаграфіі. Тут-жа змогуць атрымаць неабходную кансультацыю настаўніка. У распараджэнні вучняў будуць таксама кабінеты фізікі, хіміі і прыродазнаўства. Там можна будзе самастойна праводзіць доследы і лабараторныя работы, якія патрабуюцца праграмай.

Самае важнае цяпер — правільна размеркаваць дзень вучня. Тут галоўная роля адводзіцца бацькам. Дзіця трэба прывучаць да пэўнага рэжыму і парадку. Правільнае чаргаванне працы разумовай з працай фізічнай і з адпачынкам— залог паспяховай падрыхтоўкі да экзаменаў.

Пасля школы дзіця павінна паўтары-дзве гадзіны адпачыць, выканаць свае абавязкі па гаспадарцы, а потым пачаць падрыхтоўку да ўрокаў. Пачынаць трэба з цяжэйшых прадметаў. Спачатку вывучыць правіла, потым выканаць пісьмовае практыкаванне або рашаць задачы, прыклады.

Вусныя прадметы трэба чытаць не спяшаючы, удумваючыся ў кожны абзац, а потым прадумаць план адказу настаўніку, што дапаможа сядома засвоіць прачытанае. Праз кожныя 45 хвілін заняткаў дома неабходна рабіць 5—10-хвілінныя перапынкі, каб асвяжыць памяць, аднавіць сілы. Пасля некалькіх гадзін заняткаў дзіця павінна выйсці з дому, заняцца рухавымі гульнямі на свежым паветры. Гэта не толькі асвяжае галаву, але і ўмацоўвае здароўе.

Класціся спаць дзеці павінны заўсёды ў адзін і той-жа час, не пазней 10, а старэйшыя школьнікі — не пазней 11 гадзін вечара.

Вось як арганізуе свой дзень вучаніца пятага класа Мінскай сярэдняй школы № 24 Ларыса Чараднічэнка.

Вярнуўшыся са школы, Лора абедае і выконвае свае хатнія абавязкі. Бацька і маці на рабоце, таму Лора сама ідзе ў магазін за прадуктамі і прыбірае кватэру, што займае гадзіну-паўтары. За гэты час асвяжаецца памяць і можна брацца за ўрокі. З поўчацвёртай да шостай гадзіны Лора рыхтуецца да ўрокаў і экзаменаў. Спачатку выконвае заданне па арыфметыцы, потым па рускай або беларускай мовах. Спачатку вучыць правіла, а затым абдумана выконвае практыкаванне. Піша чыста і акуратна.

Пасля 10—15-хвіліннага адпачынку Лора вучыць вусныя прадметы. Два разы чытае па падручніку ўрок і вучыць не спяшаючы. Пасля першага чытання складае вусна план прачытанага, задае сабе пытанні і сама на іх адказвае. Пасля чытае другі раз. Так лепш засвойваюцца вусныя прадметы. Ніколі не забудзеш таго, што сам сабе пераказаў, ды яшчэ паказаў па карце.

Да шостай гадзіны Лора ўсё вывучыла і паўтарыла і выйшла пагуляць з сяброўкамі гадзіну-паўтары ў лапту.

Часам мама затрымліваецца на рабоце, тады Лора ідзе ў дзіцячы сад за малодшым брацікам. Гэта добрая прагулка і вялікая дапамога маме. Лора любіць свайго брата. Пасля прагулкі на свежым паветры яна забаўляецца з ім дома. Павячэраўшы, дзяўчынка чытае мастацкую літаратуру, вельмі любіць творы Гайдара.

Бацькі Ларысы самі працуюць упарта і змалку прывучаюць да працы сваіх дзяцей. Правільнае спалучэнне вучобы з выкананнем хатніх абавязкаў садзейнічае фармаванню камуністычнага светапогляду, развівае пачуццё калектывізму, прывівае любоў да бацькоў, павагу да старэйшых і малодшых. Працавітасць дапамагае дзецям добра вучыцца. Ларыса Чараднічэнка дысцыплінаваная, старанная, вучыцца выдатна. Яна добры таварыш, дапамагае сяброўкам у вучобе.

Не кожнае дзіця ў адсутнасці дарослых здольна ўседзець за ўрокамі, калі на вуліцы чакаюць таварышы, ды ярка свеціць сонца. Маці і бацька не бачаць, а таварышы — побач. Вучань закрывае кнігу і бяжыць на вуліцу. А тут забываецца і пра ўрокі і пра экзамены. Што-ж у такім выпадку рабіць? Прыйшоўшы з работы, бацькі павінны праверыць, як падрыхтавала дзіця ўрокі. Не падрыхтавала — прымусіць зараз-жа вучыцца. Калі кантроль не дапамагае, трэба звязацца з класным кіраўніком, з дырэктарам школы.

Вучань пятага класа Лёня Аксёнчыкаў ніколі дома не вучыўся. Класны кіраўнік тав. Балоціна дамовілася з бацькамі, каб прысылалі яго ў школу рыхтаваць урокі. З таго часу Лёня кожны дзень з трэцяй да пятай гадзіны выконвае хатнія заданні ў піянерскім пакоі ў прысутнасці старшай піянерважатай Кановіcкай. Разам з ім рыхтуюць урокі яшчэ некалькі вучняў. Цяпер Аксёнчыкаў пачаў лепш вучыцца.

Экзамены — самы адказны перыяд у жыцці дзіцяці. Таму і школа і сям'я павінны стварыць усе ўмовы для нармальнай работы вучня дома і ў школе.

**А. КАНЦАВАЯ,**
дырэктар Мінскай сярэдняй школы № 24.



Хутка пачнуцца экзамены ў школах. Вучаніца дзесятага класа Ірына Іванова праводзіць дыктант з сястрой Таняй, вучаніцай чацвёртага класа.

Фото П. Нікіціна

Наталля ЗАБІЛА

Мал. А. Волкава.

# Марына Змітраўна



*Вядомая украінская паэтэса Наталля Забіла напісала багата твораў для дзяцей. Вялікую любоў у юных чытачоў заслужылі яе кнігі: «Ясаччына кніжка», «Вяснянка», «Ластаўкі», «Лічылачка», «Пад ясным сонцам» і іншыя.*

*Многія вершы Наталлі Забіла перакладзены на рускую мову і на мовы іншых народаў Совецкага Саюза. Яе творы вызначаюцца яснасцю, пpастатой, паэтычнасцю. Яны з цікавасцю чытаюцца як маленькімі, так і дарослымі чытачамі.*

У Марыны Змітраўны
Столькі розных спраў.
Без Марыны Змітраўны
Хто-б усё прыбраў?

Хто прыгожа ложачак
Коўдраю заслаў?
Хто падлогу венікам
Скрозь пазамятаў,
Выцер пыл анучкаю
З крэслаў і з акна?

Ўсё Марына Змітраўна
Ўсё сама яна!





У Марыны Змітраўны
Пяць малых дзяцей,
Ды ад самай раніцы
Тысячы гасцей.

З кожным паздароўкайся,
Ведай — што, куды.
Дай таму цукерачку,
А таму — вады.



Той гуляць папросіцца,
Гэты з лаўкі ўпаў...
У Марыны Змітраўны
Многа-многа спраў.



На сямейку гэткую
Згатаваць абед —
Не, з такою справаю
Жартаваць не след!

Зеляніны смачнае
Да баршча нарэж.
Боршчыку наварана,
Колькі хочаш — еш!



А Марына Змітраўна
Й піражкі пячэ:
Збоку толькі глянеце —
Слінка пацячэ.

У Марыны Змітраўны
Умелая рука:
Лепшага не знойдзеце
Вы й будаўніка.

І дамы, і фабрыкі —
Што тут не ўстае!
Хто збудуе гэтулькі
Апрача яе?

А калі увечары
Дзеці лягуць спаць,
Тут Марыне Змітраўне
Трэба й пачытаць.

Сядзе, перагортвае
Кніжныя лісткі.
Любіць пад малюнкамі
Разглядаць радкі.



Што там надрукована
І аб чым тут сказ?
Знаць-бы ўсё хацелася!
Ды не ранні час.

От і сон з дрымотаю
У пакой ідуць.
І Марыну Змітраўну
Спатанькі кладуць.



Хіба-ж не стамляюцца
Людзі ад турбот?
А Марыне Змітраўне
Толькі пяты год...

Вось яна і ўмылася,
Ляжа адпачыць.
Вось яна, маленькая,
Моцна-моцна спіць.

Пераклад Эдзі Агняцвет





# ХАДЖЭННЕ ЗА ТРЫ МОРЫ

Амаль два стагоддзі Індыя была англійскай калоніяй і пераносіла бязлітасную эксплуатацыю, аднак гераічная вызваленчая барацьба індыйскага народа ніколі не спынялася. У 1947 г. індыйскі народ атрымаў вялікую перамогу: брытанскія імперыялісты былі вымушаны прадаставіць Індыі самастойнасць; у 1950 г. Індыя была абвешчана рэспублікай. За мінулыя пяць год індыйскі народ дабіўся значных поспехаў у гаспадарчым і культурным будаўніцтве. Вялікія поспехі мае ён і ў барацьбе за мір. Зараз Індыя займае ўсё больш і больш віднае месца сярод краін, якія змагаюцца за нацыянальную незалежнасць.

Савецкія людзі вельмі цікавяцца Індыяй. У нас усё часцей наладжваюцца выстаўкі індыйскага мастацтва, дэманструюцца індыйскія кінофільмы, перакладаецца індыйская літаратура. Такая-ж вялікая цікавасць да нашага Саюза і ў прагрэсіўнай грамадскасці Індыі.

Велізарная цікавасць да гісторыі і багацейшай культуры Індыі зноў і зноў накіроўвае нашу ўвагу да падарожжа Афанасія Нікіціна — аднаго з першых еўрапейцаў, які пабываў у Індыі і пакінуў нам цікавейшыя запіскі аб сваім падарожжы...

Сярэдзіна XV стагоддзя. Хутка расце магутнасць Маскоўскага княства, якое паступова збірае ўсе рускія землі ў адзіную рускую цэнтралізаваную дзяржаву. Праўда, яшчэ існуюць самастойныя княствы: Цверское, Разанскае і рад іншых, але яны адыгрываюць ужо другарадную ролю. Развіваецца гаспадарка рускіх зямель, расце гандаль з іншымі дзяржавамі. Рускія купцы гандлююць з Польшчай, Крымскім і Казанскім ханствамі, нярэдка наведваюць Усходняе Закаўказзе, дзе існавала тады дзяржава Шырван-шаху.

У 1466 г. некалькі цверскіх і маскоўскіх купцоў на двух караблях накіраваліся ў Закаўказзе. Сярод цверскіх купцоў быў і Афанасій Нікіцін.

Цяжка і небяспечна было падарожнічаць у тыя часы: ішлі няспынныя войны, адбываліся рабаўнічыя набегі, на моры гаспадарылі піраты. Па вадзе перасоўваліся тады на парусных суднах, па сушы — конна. Таму падарожжы працягваліся доўга, па некалькі год.

Па Волзе падарожжа прайшло спакойна, але блізу Астрахані, ужо зусім недалёка ад Каспійскага мора, на караван напалі татары і захапілі абодва караблі. Тавар татары забралі, але большую частку людзей адпусцілі.

Нягледзячы на няўдачу гандлёвай экспедыцыі, Афанасій Нікіцін не паў духам. Ён вырашыў працягваць падарожжа адзін, на свой страх і рызыку. Афанасія Нікіціна вабілі багатыя поўднёвыя краіны, пра якія расказвалі шмат цудоўнага (у асноўным няпраўдападобнага) і пра якія амаль нічога дакладнага не было вядома. Асабліва цікавіла яго Індыя, адкуль прывозілі розныя прыправы (перац, гваздзіку, карыцу і да т. п.), слановую косць, каштоўныя камені, прыгожыя тканіны. Гандаль з Індыяй быў надзвычай выгадны, але цяжкі і небяспечны.

Перашкоды не спалохалі рускага падарожніка. Афанасій Нікіцін дабраўся да Баку, на караблі перасек поўднёвую частку Каспійскага мора, прайшоў праз усю Персію і ў Ормузе сеў на карабель, які ішоў у Індыю. У 1469 г., праз тры гады пасля выхаду з Цверы, Афанасій Нікіцін высадзіўся ў г. Чауле, на заходнім узбярэжжы Індыі.

Не затрымліваючыся тут, падарожнік накіраваўся ўглыб краіны і дайшоў да Бідара, дзе і асталяваўся даволі надоўга.

У XV стагоддзі Індыя была раздроблена на рад самастойных дзяржаў. Адной з самых моцных была Бахманідская дзяржава, якая займала цэнтральную Індыю; па тэрыторыі гэтай дзяржавы і падарожнічаў Афанасій Нікіцін.

Бідар, дзе спыніўся Афанасій Нікіцін, быў сталіцай і буйнейшым эканамічным цэнтрам дзяржавы Бахманідаў (так называлі сябе султаны, а па іх імені называлася і ўся краіна). Афанасій Нікіцін апісвае магутныя сцены вакол горада, палацы султана і знаці, прыводзіць шмат звестак аб рамёствах і гандлі. Больш за ўсё ў Бідары гандлявалі коньмі, тканінай і... рабамі, г. зн. тымі-ж індыйцамі, паланёнымі ў час вайны ў суседніх дзяржавах.

З Бідара Афанасій Нікіцін правеў рад паездак па іншых гарадах краіны: ездзіў у Аланд, Гульбаргу, Райчур, Парват. У гэтых вялікіх, ажыўленых гарадах Індыі падарожнік бачыў цудоўныя палацы і храмы, якія здзівілі яго характвам і велізарнымі памерамі. Асабліва падабалася яму мастацкая разьба па камені, якою славяцца індыйскія майстры.

Афанасій Нікіцін заўважыў і апісаў многія бакі індыйскага жыцця, расказаў пра клімат, карысныя выкапні, расліны і жывёльны свет краіны.

Найбольшую ўвагу падарожніка прыцягнулі сланы — самыя буйныя наземныя млекакормячыя, па 3,5—4 тоны вагой пры вышыні (у плячах) у 3 метры. У Індыі ўжо здаўна сланы былі прыручаны і шырока выкарыстоўваліся ў гаспадарцы, на лесараспрацоўках, у якасці транспарту. Многа дапамагалі яны ў ваеннай справе. Іх закоўвалі ў стальныя даспехі, а на спіне ставілі спецыяльную вежу, дзе размяшчаліся стралкі з лукамі і стрэламі. Гэтыя гіганты лавінай урываліся ў рады ворагаў, таптаці іх, хапалі і кідалі хобатам, а зверху стралкі абсыпалі праціўніка стрэламі.

Афанасій Нікіцін апісвае малпаў і змей і да нашага часу надзвычай шматлікіх у Індыі. Паводле падлікаў індыйскіх вучоных, зараз у Індыі блізу населеных пунктаў жыве каля 60 мільёнаў малпаў. Яны наносяць велізарныя страты палям і садам, але знішчыць — хоць-бы часткова — гэтых чатырохногіх рабаўнікоў нельга: насельніцтва лічыць іх свяшчэннай жывёлай і баіцца чапаць.

«Індыяне-ж, — са здзіўленнем запісвае наш падарожнік, — вала называюць «бацькам», а карову «маці». Апісаўшы статую такога «свяшчэннага» быка, высечаную з цэлай скалы, ён гаворыць далей: «А цалуюць яго ў капыта, а сыплюць на яго кветкі». Большасць індыйцаў і цяпер не ўжывае ялавічыны, лічачы гэта кашчунствам. Каровы і зараз свабодна ходзяць па вуліцах гарадоў. Патокі аўтамашын вымушаны асцярожна аб'язджаць карову, якая развалілася сярод вуліцы. Прагнаць яе нельга: яна-ж — «свяшчэнная»!

Змяя таксама лічыцца свяшчэннай жывёлай, у тым ліку і такая ядавітая, як кобра. Гэтыя рэлігійныя забабоны дорага каштуюць насельніцтву: кожны год у Індыі ад змяінага яду гіне каля 20 000 людзей.

Усе еўрапейскія падарожнікі, якія пабывалі ў тыя часы ў Індыі — Конці, Вартэма і інш. — з захапленнем апісвалі бляск і раскошу індыйскай знаці, праслаўлялі Індыю, як нейкі рай на зямлі. Афанасій Нікіцін быў равумным, назіральным чалавекам, і ён разгледзеў сапраўднае становішча спраў у краіне. Бляск не скрыў ад зоркіх вачэй рускага падарожніка цяжкае становішча працоўных — сялян і рамеснікаў, за кошт якіх ісвалі ўсе гэтыя раскошныя раджы і султаны. «Зямля вельмі шматлюдная, — пісаў Афанасій Нікіцін, — а сельскія людзі вельмі бедныя, баяры-ж багатыя і раскошныя». Значную частку ўраджаю забіралі памешчыкі, другую частку — султан,

дзесятую частку бралі царкоўнікі. І нярэдка селяніну не хапала на жыццё: голад — звычайная з'ява ў Індыі. Але больш за ўсё пакутавала насельніцтва ад няспынных войн і набегаў. Руйнаваліся гарады, палалі вёскі, вытоптваліся палі, а людзей гналі ў рабства.

Афанасій Нікіцін быў сведкай жорсткай вайны бахманідскага султана з адной з суседніх дзяржаў. Ён падрабязна апісаў асаду і штурм аднаго горада, якія працягваліся 20 дзён. У арміі, якая асадзіла горад, канчалася харчаванне, і, як піша Афанасій Нікіцін, «рацъ не піла, не ела, пад горадам стаяла з гарматамі». Калі-ж горад быў, нарэшце, узяты, пачалося страшэннае збіванне мірных жыхароў: «Выразалі 20 тысяч пагалоўя мужчынскага і жаночага, — запісаў падарожнік, — а 20 тысяч узялі ў палон...». Палонных прадалі ў няволю. Нягледзячы, аднак, на асобныя поспехі, вайна была няўдалай для Бахманідскай дзяржавы, падарвала яе фінансы і паслужыла пачаткам яе крушэння.

Гэтыя няспынныя кровапралітныя войны разарылі краіну, прывялі да заняпаду культуры, аслабілі супраціўленне індыйскага народа англійскім захопнікам.

Больш двух год прабыў у Індыі Афанасій Нікіцін. Усё часцей і часцей успамінае ён Рускую зямлю, сумуе аб далёкай радзіме. Індыя перастала яго цікавіць; думка пра зварот на радзіму не давала яму спакою.

У пачатку 1472 года Афанасій Нікіцін, купіўшы некаторую колькасць індыйскіх тавараў, накіраваўся назад. Але адважны падарожнік памёр, крыху не дайшоўшы да Смаленска.

Пасля смерці Афанасія Нікіціна засталіся яго запіскі аб падарожжы: «Хаджэнне за тры моры». Гэта кароткае, але дакладнае апавяданне спрактыкаванага, назіральнага падарожніка аб усім бачаным. Афанасій Нікіцін паехаў у Індыю з гандлёвымі мэтамі, аднак ён апісаў не толькі гандаль, але і многія бакі індыйскага жыцця, якія не маюць да гандлю ніякіх адносін. Яго запіскі — багацейшая крыніца звестак аб прыродзе Індыі, занятках і быце яе насельніцтва, гарадах, помніках мастацтва, дзяржаўным ладзе, рэлігіі, ваеннай справе, гандлі, багаццях краіны. Ён апісаў і здзіўляючую раскошу знаці і цяжкое жыццё простых людзей. І заўсёды памятаў Афанасій Нікіцін аб сваёй радзіме. Гэтая думка падтрымлівала яго ў цяжкія моманты падарожжа. Ён з хваляваннем пісаў у дзённіку: «На гэтым свеце няма краіны падобнай да яе, хоць баяры Рускай зямлі несправядлівыя. Але няхай упарадкуецца Руская зямля і няхай будзе ў ёй справядлівасць».




Карта маршруту Афанасія Нікіціна.

Больш шасці год працягвалася падарожжа, праведзенае адным чалавекам, які не меў нічыёй падтрымкі. Але ніякія цяжкасці і небяспекі не маглі спыніць адважнага рускага чалавека. Афанасій Нікіцін — адзін з выдатнейшых рускіх падарожнікаў, таленавіты пісьменнік, які надзіва ярка і праўдзіва апісаў старую Індыю.

**І. ШЫШКІН**

## *ПАРАДЫ ВЫШЫВАЛЬШЧЫЦАМ*

# Аздобныя швы*

**7. Швы «елачка»** знешне нагадваюць галінку елачкі. Верхнія шыўкі размешчаны так, што адна частка шыўка ўтварае сцябло, а другая — іголачку. На адваротным баку атрымліваюцца прамыя шыўкі, якія пачаргова разыходзяцца з цэнтра.



Тэхніка выканання шва: матэрыял трымаць на сябе, верхнія шыўкі «елачкі» падзяліць на дзве поўпятлі, адну з іх размясціць амаль паралельна агульнаму напрамку, другую — пад вуглом. Кожны пракол з правага боку на левы рабіць на ўзроўні выхаду іголкі з левага боку на правы, а праколы з левага боку на правы — усе на аднолькавай адлегласці адзін ад другога. «Елачку» можна рабіць у адзін шывок, чаргаваць шыўкі з аднаго боку і з другога, рабіць у два і тры шыўкі. У такім варыянце шыўкі рабіць па два або па тры пачаргова, з аднаго боку два шыўкі і з другога два.

Шоў «елачка» ў два і тры шыўкі — вельмі прыгожая аздоба для дзіцячых рэчаў. Вышываецца мулінэ (у 2—3 ніткі) у залежнасці ад таўшчыні матэрыялу.

**8. Абкідачны шоў.** У асноўным ужываецца для аздобы края матэрыялу. Трэба падшыць край матэрыялу, потым каляровай ніткай мулінэ (у



дзве ніткі) абшыць пецельным швом край (напрыклад, сіняй ніткай зрабіць маленькія шыўкі, перавярнуць шоў да сябе і рабіць доўгія шыўкі чырвонай ніткай). Атрымліваецца такі-ж шоў, але з левага боку.

**9. Швом «трохвугольнік»** аздабляюць краі вырабу. Трэба замацаваць іголку ўверсе шва на левы бок, вывесці іголку на



правы бок і накіраваць уніз, каб атрымалася пятля, зрабіць адзін шывок нахільна ўлева, другі — прама, трэці — нахільна ўправа, увесь час падхопліваючы нітку пятлёй уніз, каб край атрымаўся як абкідачны.

Гэты шоў ужываюць у асноўным для аздобы бялізны і адзення нованароджаным, дзе не павінны адчувацца рубцы, у падшыўцы пялёнак, прасцінак, распашонак, нагруднікаў, кофтачак, начных кашуль. Вышываецца ў 2—3 ніткі мулінэ. Дзіцячыя рэчы трэба вышываць яркай ніткай — чырвонай, ружовай, блакітнай, зялёнай.

10. **Шоў «вілюшка».** На матэрыяле каляровай ніткай нанесці прамыя шыўкі з аднолькавай колькасцю нітак на іголку і пад іголку. Ніткай другога колеру (у 3—4 ніткі) абвіць зверху нанесеныя раней шыўкі (як відаць на рысунку). Мож-



на гэты шоў паўтарыць два разы ўшчыльную, тады аснову шва прашыць у шахматным парадку ў два рады (гэта значыць, калі сцяжок знаходзіцца ўверсе, то няма яго ўнізе і наадварот). Абвіваць трэба, пачынаючы ўсё з аднаго боку, каб атрымалася «вілюшка».

Шоў «вілюшка» ўжываецца для аздобы жаночага адзення (блуз, сукенак), дзіцячага, у мастацкай гладзі як аздобны шоў, для разбіўкі сурвэты на клеткі, для аздобы края на сукне, шоўку, аксаміце.

### Адказы на пытанні чытачоў

Які тон нітак трэба лічыць першым?

Заўсёды пры вышыўцы першым тонам трэба лічыць самы светлы тон, калі ў ружы 4 таны, то першы будзе: 1 тон — светларужовы, 2 тон — цёмнаружовы, 3 тон — светлачырвоны, 4 тон — цёмначырвоны.

Вось гэтымі танамі павінна прыкладна быць вышыта ружа. Як размяшчаць гэтыя таны? Звычайна ў ружы верхнія пялёсткі больш светлыя, пачынаць вышываць іх трэба з першага светлага тону. Ніжнія пялёсткі больш цёмныя, вышываць трэба з другога тону або пачаць з другога, потым першы тон у сярэдзіне, зноў другі, трэці, чацвёрты.

Сярэдзіна ружы вышываецца цёмным тонам трэцім і чацвёртым, каб стварыць глыбіню кветкі.

Чашачка ў ружы вышываецца з-пад адвароту цёмным тонам 4-м. Сярэдзіну чашачкі трэба зрабіць больш выпуклай, трэба яе асвятліць першым светлым тонам і к канцу пялёсткі зноў зацямніць.

**Е. Красічкава**

* Працяг. Пачатак гл. у № 4.

# *Парады гаспадыням*

### САЛАТА З МАСЛАМ І ВОЦАТАМ

Абмытую і абсушаную зялёную салату нарэзаць упоперак лісця і скласці ў салатнік. Перад падачай на стол паліць соусам, прыгатаваным з воцату і расліннага масла, перамяшаць і пасыпаць кропам або зяленівам пятрушкі. Можна дадаць свежыя агуркі, нарэзаныя кружочкамі, а таксама скарынкі белага хлеба, нацёртыя часнаком і нарэзаныя ў выглядзе маленькіх ромбаў і пакладзеныя паверх салаты. Падаюць салату да ўсіх страў са смажанага і варанага мяса, а таксама да смажанай рыбы.

На 300 г зялёнай салаты — $^{1}/_{4}$ шклянкі соусу з воцату і расліннага масла.

### ГАЛУШКІ З ТВАРАГУ

Тварог прапусціць праз мясарубку, або працерці праз сіта, адбіць у тварог 2 сырыя яйкі, пакласці цукар, 1 ст. лыжку растопленага масла, $^{1}/_{2}$ чайнай лыжкі солі і ўсё гэта добра перамяшаць. Затым у атрыманую масу ўсыпаць шклянку прасеянай мукі і замясіць. Тварожнае цеста пакласці на пасыпаны мукой стол і разрэзаць на чатыры роўныя часткі, кожную частку скатаць у форме тонкай каўбаскі, злёгку прыплюснуць, разрэзаць на невялікія касячкі (ромбікі), якія апусціць у падсолены вар і гатаваць, пакуль яны не ўсплывуць на паверхню.

Гатовыя галушкі дастаць шумоўкай на блюда, паліць растопленым маслам, пасыпаць тоўчанымі сухарамі, падсмажанымі да залацістага колеру. На стол падаць іх гарачымі са смятанай.

Звараныя галушкі можна запячы ў духоўцы. Для гэтага, паклаўшы на патэльню, іх трэба заліць смятанай і спырснуць маслам.

Патэльню змясціць на маленькую бляшку з вадой, паставіць яе ў гарачую духоўку і трымаць там, пакуль галушкі не пакрыюцца румянай скуркай.

На 500 г тварагу — $^{1}/_{2}$ шклянкі смятаны, 2 яйкі, 3 ст. лыжкі цукру, 1 шклянка пшанічнай мукі, 2 ст. лыжкі сухароў і 3 ст. лыжкі масла.

### ЯК ВЫВОДЗІЦЬ ПЛЯМЫ

Плямы ад іржаўчыны, чарніла і фарбы выводзяць кіслотамі — шчавелевай, лімоннай або віннакаменнай. У залежнасці ад таго, наколькі застарэла пляма, на шклянку гарачай вады бяруць ад 3 да 20 грамаў адной з адзначаных вышэй кіслот (у сухім стане гэта крышталы). Пасля растварэння кіслаты ваду падаграваюць да кіпення і апускаюць у яе на кароткі час частку тканіны з плямай. Затым тканіну прамываюць цёплай вадой. Застарэлыя плямы апрацоўваюць 2—3 разы. У час прамыўкі тканіны ў ваду дадаюць некалькі кропель нашатырнага спірту.

Свежыя плямы ад чарніла можна вывесці, праціраючы іх чыстым шматксм, змочаным цёплым малаком. Рэчы з застарэлымі чарнільнымі плямамі пакідаюць у малацэ на некалькі гадзін, а затым прамываюць. Трэба сачыць за тым, каб малако не засохла на тканіне. Пасля чысткі рэчы прамываюць цёплай і халоднай вадой.

Для вываду чарнільных плям бяруць таксама моцную воцатную кіслату (можна воцатную эсенцыю, разбаўленую вадой у адносінах 1:2) або сумесь воцатнай і шчавелевай кіслот. Можна ўзяць і дэнатураваны спірт, ён рэкамендуецца для вываду плям з каляровых рэчаў.

Плямы ад віна, фруктаў і ягад, калі яны свежыя, можна вывесці гарачай вадой. Для гэтага нацягваюць тканіну над якой-небудзь пасудай і льюць невялікім струменем кіпячую ваду з чайніка да поўнага знікнення плямы.

Можна выводзіць плямы і наступнымі спосабамі: 1) засыпаць пляму сталовай соллю і прамыць мыльнай вадой; 2) замачыць у малацэ або сываратцы і вымыць; 3) працерці растворам перакісу вадарода (1 чайная лыжка на $^{1}/_{2}$ шклянкі вады), гэты спосаб прыдатны для белых тканін. У перакіс вадарода трэба дадаць 2—3 часткі нашатырнага спірту; 4) нацерці пляму сумессю гліцэрыны і яечнага жаўтка (1:1), пакінуць на некалькі гадзін, а затым прамыць вадой. Апошні спосаб рэкамендуецца для каляровых тканін.

Плямы ад сажы і копаці спачатку змочваюць чыстым шкіпінарам і праціраюць шматком тканіны. Пасля гэтага праціраюць з дапамогай шчоткі моцным мыльным растворам і прамываюць, як звычайна. Калі пляму нельга вывесці адным шкіпінарам, бяруць сумесь шкіпінару з яечным жаўтком.

Калі пасля вывядзення копаці на рэчах застаюцца плямы іржаўчыны, іх выводзяць гарачым растворам шчавелевай або лімоннай кіслаты (20—30 грамаў кіслаты на 1 літр гарачай вады). Плямы з афарбаваных рэчаў трэба выводзіць асцярожна, бо афарбоўка іх можа змяніцца. У апошнім выпадку трэба рэчы прамыць у вадзе, у якую дадана крыху нашатырнага спірту.

## КРАСВОРД



**Па гарызанталі:** 5. Прыток ракі Об. 7. Шырокае жаночае паліто. 9. Сталіца саюзнай рэспублікі. 11. Ласунак. 12. Гара на Каўказе. 13. Паэма Вергілія. 15. Паэма А. Бялевіча. 17. Від зброі. 18. Краіна ў Азіі. 19. Змазка для машын. 20. Сталярны інструмент. 22. Начынне, якое захоўвае вадкасць ад астывання. 24. Грашовая адзінка. 29. Прылада для аховы ад дажджу і сонца. 30. Краіна народнай дэмакратыі. 32. Сельскагаспадарчая машына. 33. Замкнёная групка людзей. 34. Сумесь тлустых кіслот.

**Па вертыкалі:** 1. Канцовы пункт спаборніцтва. 2. Тасьма. 3. Карлікавая дзяржава ў Еўропе. 4. Поўднёвая расліна. 6. Узор для выррабу дэталей. 7. Востраў у Міжземным моры. 8. Рыба. 9. Атмасферная з'ява. 10. Загана. 13. Горная вяршыня ў Азіі. 14. Аўтамабіль агульнага карыстання. 15. Від вучэбных заняткаў. 16. Месяц. 20. Папраўка старога. 21. Украінскі народны пясняр. 23. Найлепшы гатунак. 25. Пустазелле. 26. Адбітак з друкаванага набору. 27. Сталіца саюзнай рэспублікі на Каўказе. 28. Рака ў Сібіры. 29. Крупяная культура. 31. Дрэва.

### АДКАЗ НА РЭБУС, ЗМЕШЧАНЫ У № 3.

«Совецкая Армія мае магутнейшую зброю, гэта зброя — ленінізм».

На першай старонцы вокладкі: малюнак **І. Давідовіча.**

Адказны рэдактар А. П. УС. Рэдакцыйная калегія: К. А. АБУШЭНКА, М. Н. БАРСТОК, Г. Л. ДАЗОРЦАВА, А. Н. ЗАХАРАВА, М. Ф. НІКІФАРАВА, Ф. А. НОВІКАВА, А. І. ФЕДАСЮК, В. І. ФІЛІПАВА.

АТ 04017. Журнал «Работница и крестьянка» на белорусском языке. Издание ЦК КП Белоруссии.

Падпісана да друку 7.V.55 г. Адрас рэдакцыі: Мінск, Праспект імя Сталіна. Дом друку. Пакой 23. Тэлефон 2-33-03.

Друкарня імя Сталіна, Мінск. Цана 1 руб. 80 кап. Дадатак — выкрайка. Друк. арк. 3. Аўт. арк. 4. Тыраж 100 000 экз. Заказ 262.

# Моды




1961 г.